Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 24 (5398)
ЧАЦВЕР
30
СТУДЗЕНЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПРЫЁМ ДЭЛЕГАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ БУРАТ-МАНГОЛЬСКАЙ АССР КІРАЎНІКАМІ ПАРТЫІ І ЎРАДА Ў КРЭМЛІ

АБ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ — ПРАМОВА САКРАТАРА ЦК ВКП(б) ТАВ. А. А. АНДРЭЕВА НА 1-И НАРАДЗЕ ПА ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПРЫ ЦК ВЛКСМ 19 СТУДЗЕНЯ 1936 Г.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — СТАХАНАЎСКАМУ ГОДУ — СТАЛІНСКІ ЎРАДЖАЙ

А ЛЮБОВІЧ — АБ БУДАЎНІЦТВЕ І ВЫТВОРЧАСЦІ БУДМАТЭРЫЯЛАЎ

ПРАМОВЫ ТТ. ГОЛУБА Я. Т. І ЗАЙЦАВА Ф. І. НА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЗЕ ПА ЎРАДЖАЙ НАСЦІ.

Стаханаўскаму году— сталінскі ўраджай

1936 год уваходзіць у гісторыю сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР пад слаўным іменем стаханаўскага года.

Грандыёзныя поспехі індустрыялізацыі, калектывізацыі, аўладанне новай тэхнікай, выхаванне і рост кадраў, людзей, якія ўмеюць узяць ад тэхнікі ўсё, што яна можа даць, якія мы маем у рэзультаце ажыццяўлення пад кіраўніцтвам вялікага **Сталіна** адзіна правільнай генеральнай лініі партыі, стварылі ўсе ўмовы для новага магутнага разбегу, аб якім па-прароцку з геніяльнай празорлівасцю гаварыў таварыш **Сталін**.

Тры гады назад, у студзені 1933 года, таварыш **Сталін** у сваім дакладзе аб выніках першай пяцігодкі сказаў, што «мы можам дабіцца таго, каб, скажам, да другой паловы другой пяцігодкі ўзяць новы магутны разбег».

Гэты новы магутны разбег, які геніяльна прадбачыў і ўказаў таварыш **Сталін**, цяпер бярэцца як у галіне прамысловасці, так і ў галіне сельскай гаспадаркі.

Выдатныя дасягненні рабочых-стаханаўцаў, якія ламаюць старыя нормы выпрацоўкі, перакрываюць па раду галін прамысловасці сусветныя рэкорды; пераход прадпрыемстваў і нават галін прамысловасці да стаханаўскіх дэкад, месяцаў, да стаханаўскага года; каласальныя рэзервы, выяўленыя ў прамысловасці стаханаўскім рухам,—усё гэта дазваляе ўзяць у прамысловасці новы магутны разбег, не толькі выканаць, але і перавыканаць планы работы прамысловасці ў 1936 годзе.

У сельскай гаспадарцы 1936 год пачынаецца як год велізарнага ўздыму мільённых калгасных мас на бараньбу за сталінскі высокі ўраджай.

Пастаўленая таварышам **Сталіным** на нарадзе перадавых камбайнераў задача — давесці за бліжэйшыя 3—4 гады штогадовую вытворчасць хлеба да 7—8 мільярдаў пудоў — падхоплена мільёнамі.

Калгасы ўзмацніліся. Мы маем далейшае ўмацаванне машыннай базы ў сельскай гаспадарцы, аўладанне тэхнікай новых сельскагаспадарчых машын, як трактары, камбайны, ільноцерабілкі, выхаванне і рост новых людзей — арганізатараў калгаснай вытворчасці, герояў і гераінь калгаснай працы, якіх клапатліва і любоўна вырошчвае і ўзнімае большэвіцкая партыя на чале са **Сталіным**. Усё гэта стварае ўсе ўмовы для таго, каб 1936 год стаў годам новага магутнага разбегу і ў галіне сельскай гаспадаркі.

«Жыць стала лепш, таварышы. Жыць стала весялей. А калі весела жывецца, работа спорыцца. Адсюль і высокія нормы выпрацоўкі. Адсюль героі і гераіні працы». Гэтыя выдатныя словы любімага **Сталіна** жыццё пацвярджае ў кожным кутку, на кожным заводзе і ў кожным калгасе нашага неабдымнага Совецкага Саюза.

Паглядзіце, якое велізарнейшае бязмежнае давер'е да партыі, якая гарачая любоў да вялікага **Сталіна**, якая цвёрдая ўпэўненасць у сілах рабочага класа і калгаснага сялянства, якое велізарнае жаданне выканаць указанні **Сталіна**, дабіцца ўжо ў гэтым годзе сталінскіх ураджаяў гучэлі ў выступленні кожнага ўдзельніка ўсебеларускай нарады перадавікоў ураджаю!

Калі ў 1935 годзе самая вялікая выпрацоўка на трактар у Беларусі была 700 гектараў, то на 1936 год ужо разгарнуўся паход за тое, каб даць не менш 1.000 гектараў на трактар. Асобныя перадавікі трактарысты, як, напрыклад, т. Чубакоў, абавязваюцца даць 1.600 гектараў на трактар. Няма сумнення, што трактарысты, аўладаўшыя пабольшэвіцку тэхнікай сваёй справы, з гонарам выканаюць гэтыя абавязацельствы.

Усебеларуская нарада перадавікоў ураджайнасці высока падняла сцяг паходу за сталінскі ўраджай.

8 цвёрдай упэўненасцю ўсебеларуская нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі, лепшых людзей калгасаў Совецкай Беларусі заклікае ўсё калгаснае сялянства БССР дабіцца для ўсіх калгасаў ордэнаноснай Беларусі ўжо ў гэтым годзе ўраджаю не менш, чым 12 цэнтнераў зернавых, 4 цэнтнеры ільновалакна і 150 цэнтнераў бульбы з гектара. Гэта **мінімальная** задача, якая можа быць і будзе **перавыканана** дзесяткамі і сотнямі перадавых калгасаў.

1936 год становіцца годам карэннага ўздыму ўраджайнасці.

У калгасах разгарнуліся работы па збору і вывазцы ўгнаення, па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, разгарнулася барацьба за рэкордны сталінскі ўраджай.

Дэлегаты ўсебеларускай нарады — перадавікі ўраджайнасці, трактарысты і машыністы малатарань — зараз раз'язджаюцца па сваіх калгасах, па ўсіх раёнах.

Яны панясуць у найшырэйшыя масы калгаснага сялянства лозунг вялікага **Сталіна**. Яны будуць лепшымі прапагандыстамі і агітатарамі за большэвіцкае выкананне рашэнняў партыі, за небывалыя ўраджаі ў калгасах.

Яны будуць арганізатарамі калгаснікаў і калгасніц на разгортванне стаханаўскага руху, на аўладанне агранамічнай навукай і тэхнікай сельскагаспадарчых машын.

Яны нясуць з сабой у калгасы багацейшы вопыт перадавых калгасаў Чэрнігаўскай, Заходняй і Калінінскай абласцей.

Яны раскажуць калгаснаму сялянству, што па раду важнейшых паказальнікаў мы яшчэ значна адстаем, і ўзнімуць новую хвалю социялістычнага спаборніцтва ў кожнай брыгадзе, звяне, трактарным атрадзе.

Зараз задача раённых партыйных і совецкіх арганізацый заключаецца ў тым, каб дапамагчы гэтым энтузіястам барацьбы за сталінскі ўраджай разгарнуць на ўсю сваю большэвіцкую, арганізатарскую, прапагандысцкую і агітацыйную работу. Трэба дапамагчы ім канкрэтнай справай і так арганізаваць работу ў калгасах, каб выканаць слова, удзельнікамі нарады данае ад імя ўсіх калгаснікаў і калгасніц Совецкай Беларусі ў пісьме таварышу **Сталіну**.

Слова, данае **Сталіну**, — моцнае калгаснае слова. І сталінскі ўраджай павінен быць і будзе узяты ў гэтым годзе ў кожным соўгасе і калгасе.

ПРЫЁМ ДЭЛЕГАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ БУРАТ-МАНГОЛЬСКАЙ АССР КІРАЎНІКАМІ ПАРТЫІ І ЎРАДА Ў КРЭМЛІ

27 студзеня ў Крэмлі адбыўся прыём працоўных Бурат-Мангольскай АССР кіраўнікамі партыі і ўрада.

У 7 гадзін вечара ў зале сабраліся 67 дэлегатаў на чале з сакратаром бурат-мангольскага абкома ВКП(б) тав. **Ербанавым** і старшынёй Соўнаркома Бурат-Мангольскай АССР тав. **Оржывым**. У складзе дэлегацыі: калгаснікі—даяркі, чабаны, загадчыкі жывёлагадоўчых ферм, старшыні калгасаў, работнікі соўгасаў, работнікі культуры і мастацтва, партыйна-совецкія работнікі. Многія апранутыя ў яркія, маляўнічыя нацыянальныя касцюмы.

З'яўленне ў зале таварышоў Сталіна, Молатава, Калініна, Варашылава, Орджанікідзе, Мікяна, Андрэева, Якаўлева выклікае бурную, доўга не змаўкаючую авацыю. Воклічы на бурат-мангольскай і рускай мовах «ура», **«Няхай жыве правадыр народаў вялікі Сталін!»**, **«Няхай жыве тав. Молатаў!»**, **«Няхай жыве тав. Варашылаў!»** і зноў апладысменты, крыкі «ура» і прывітальныя воклічы.

Тав. Молатаў вітае дэлегатаў і прадастаўляе першае слова старшыні калгаса імя Варашылава, Улан-Ононскага аймака таварышу **Бадмаеву Батамаргалу**.

Яго яркая прамова, сказаная на бурат-мангольскай мове і перакладзеная потым на рускую, часта прарываецца апладысментамі. Тав. Бадмаеў расказвае аб велізарных дасягненнях свайго калгаса, аб тым, як рэзка змянілася цёмнае, жабрацкае ў мінулым жыццё бурат-мангольскіх сялян, як заможна і весела жывуць яны цяпер у калгасе.

— Мы будуем социялізм,—гаворыць Бадмаеў. І ў гэтай фразе ўчарайшага вандроўніка гучыць гордасць адроджанага народу, квітнеючай совецкай рэспублікі.

Пасля тав. Бадмаева з прамовамі выступілі наступныя таварышы: Гашунаў Угар Кандаковіч — загадчык аўпагадоўчай фермы калгаса імя Дзержынскага, Аржутава Мар'я Іванаўна—даярка калгаса імя Разумава, Шубін Н. Кіта Іванавіч — дырэктар Баргойскага аўпагадоўчага соўгаса, Балдынаў Ілья Васільевіч—старшы лейтэнант — слухач Ваеннай акадэміі імя Фрунзе, Эрдыніева Оргожап — даярка калгаса Улан-Удунга, Мяснікова Агаф'я Грыгор'еўна — даярка калгаса «Заветы Ільіча», Датэнаў Александр Андрэевіч — загадчык конефермы калгаса «Чырвоны Нельхай», Болатаў Бабу — загадчык конефермы калгаса імя Варашылава, Намсараеў Хопа — пісьменнік і Ербанаў Міхей Нікалаевіч.

Гарачай удзячнасцю партыі і ўраду, таварышу Сталіну прасякнуты ўсе прамовы выступаўшых.

Аб уздыме гаспадаркі, росце культуры і заможнасці Совецкай Бурат-Манголіі расказвалі дэлегаты кіраўнікам партыі і ўрада.

Калгаснік **Гашунаў** Угар Кандаковіч расказаў, што аўпагадоўчая ферма калгаса імя Дзержынскага, Тункінскага аймака, за 4 гады павялічыла пагалоўе ў 3 разы (з 425 да 1.305 авечак). Адначасова ў асабістым карыстанні калгасніка Гашунава ёсць 54 галавы рознай жывёлы. Аднакароўных гаспадарак у гэтым калгасе больш няма. Кожны калгасны двор мае па 2 і больш каровы. Аб гэтым-жа гаварылі і іншыя дэлегаты.

— Калі я ўступіла ў калгас, — гаворыць пажылая калгасніца **Аржутава** Мар'я Іванаўна, — у мяне былі даве каровы, цяпер у мяне 6 кароў, адначасова хутка расце пагалоўе і ў калгасе. Нас у стары час цанілі таней жывёлы, а цяпер працоўны чалавек, якой-бы ён ні быў нацыянальнасці—самы каштоўны капітал.

— У нашым калгасе,—гаворыць тав. **Болатаў** Бабу, — на кожны двор прыходзіцца 55 галоў жывёлы, а на кожную душу 11 галоў.

— Скажыце—ці дрэнна, ці добра жывецца? — пытае таварыш **Сталін** даярку калгаса «Заветы Ільіча» Мяснікову.

— Жывем добра, — адказвае весела **Мяснікова:** — у нас раней каровы былі дрэнныя, малаўдойныя, а цяпер я надойваю 2.000 літраў у год з адной кароўы. У мяне семера дзяцей. Усе вучацца, усе мараць быць адукаванымі людзьмі, і я думаю—яны даб'юцца свайго, а сама я была батрачка.

— Дзякую вам, — зварачаецца тав. Мяснікова да кіраўнікоў партыі і ўрада, — дазвольце папісаць вашы рукі сваёй мазолістай рукой.

Пад бурныя апладысменты і воклічы «ура», «Няхай жыве таварыш Сталін!» тав. Мяснікова абменьваецца рукапісканнем з таварышамі Сталіным, Молатавым, Варашылавым, Калініным і ўсімі членамі прэзідыума.

З вялікай увагай і цеплынёй выслухалі прысутныя прамову тав. **Балдынава**. Малады камандзір, з ордэнам баявога Чырвонага сцяга на грудзях тав. Балдынаў гаворыць аб абароне Совецкага Саюза, аб вучобе і падрыхтоўцы бурат-мангольскага чырвонасцяжнага каўпалка, начальнікам штаба якога ён быў. Цяпер тав. Балдынаў — слухач Ваеннай акадэміі імя Фрунзе. Не адзін ён, а звыш 10 камандзіраў з Бурат-Манголіі вучацца цяпер у ваенных акадэміях Саюза.

— У 1929 годзе, — гаворыць тав. Валдынаў, — у часе сутычкі з кітайскімі генераламі я камандаваў узводам. І байцы майго ўзвода атрымалі 5 ордэнаў за геройскія подвігі. З таго часу мы яшчэ многаму навучыліся і гатовы, як і ўвесь наш бурат-мангольскі народ, біцца за сваю непараўнаную радзіму, за Совецкі Саюз да поўнай перамогі над ворагам.

Пісьменнік **Намсараеў** Хопа расказаў, як у Совецкай Бурат-Манголіі расце нацыянальная літаратура і мастацтва. У бурацкай літаратуры ёсць цяпер усе жанры, усе формы — да верша, да рамана і п'есы. Перакладзены і перакладаюцца на бурат-мангольскую мову творы класічнай рускай літаратуры. У заключэнне тав. Намсараеў прачытаў свой верш, прысвечаны тав. Сталіну.

Сакратар бурат-мангольскага абкома ВКП(б) тав. **Ербанаў** у вялікай, поўнай зместу прамове прывёў яркія факты прыгнечання і здзекаў з бурат-мангольскага народу пры царскім рэжыме і ярчэйшыя факты росту і росквіту вызваленага народу ў брацкай сям'і народаў совецкіх рэспублік.

У заключэнне з прамовай выступіў сустрэты бурнай авацыяй і воклічамі «ура» старшыня Соўнаркома Саюза ССР тав. В. М. **Молатаў**. Першую і апошнюю фразу сваёй прамовы тав. Молатаў гаворыць на бурат-мангольскай мове.

Тав. Молатаў паведаміў, што па ініцыятыве таварыша **Сталіна** прэзідыум нарады ўносіць у прэзідыум ЦВК Саюза ССР прапанову аб узнагароджанні лепшых людзей з Бурат-Манголіі вышэйшай узнагародай Совецкага Саюза — ордэнамі. Ён таксама паведаміў аб рашэнні ўрада ўзнагародзіць прадстаўленыя на нарадзе калгасы грузавымі машынамі.

Гарачая, доўга не змаўкаючая авацыя ў гонар таварышоў Сталіна, Молатава, Калініна, Варашылава была адказам на прамову тав. Молатава.

Кожнаму дэлегату таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў і Калінін уручаюць падарункі ўрада: гадзіннікі і патэфоны з пласцінкамі.

Ад імя бурат-мангольскага народу дэлегаты падносяць кіраўнікам партыі і ўрада нацыянальныя халаты, трубкі, кінжалы.

Шасцігадовая дзяўчынка Геля Маркізава, — дачка аднаго з дэлегатаў, якая прысутнічала на прыёме, — у часе пасяджэння паднесла тав. Сталіну букет жывых кветак.

Дзесятнік Таценскага лесаўчастка, Клічаўскага леспрамгаса, К. Ф. Дыдо, ініцыятар стаханаўскага руху на лесазагатоўках БССР. Тав. Дыдо прымяніў новы метад разводкі і точкі піл, дзякуючы чаму павысіў сваю прадукцыйнасць на загатоўцы драўніны больш чым у 6 раз. Па метаду тав. Дыдо зараз працуюць сотні стаханаўцаў-лесарубаў БССР. Нядаўна Белпартвыдавецтва выпусціла брашуру «Наш метад работы на лесазагатоўках», дзе тав. Дыдо і яго напарнік В. Т. Ільінчык падрабязна расказваюць аб сваіх метадах работы.

НА ЗДЫМКУ: КУПРЫЯН ФЕДАРАВІЧ ДЫДО.

Выклік беларускіх лесазаводаў прынят

З 7 ЛЮТАГА — УСЕСАЮЗНАЯ СТАХАНАЎСКАЯ ДЭКАДА ПА ПРАДПРЫЕМСТВАХ ГАЛОЎЛЕСДРЭВА

Дырэктары віцебскага, мазырскага, рагачоўскага, хойніцкага лесазаводаў, бабруйскага і гомельскага лесакамбінатаў выклікалі праз газету «Лесная промышленность» усе прадпрыемствы сістэмы Галоўлесдрэва ўключыцца ў соцспаборніцтва на лепшае правядзенне стаханаўскай дэкады.

Галоўлесдрэў і прэзідыум ЦК саюза лесапілення цэнтра і поўдня, абгаварыўшы выклік беларускіх лесазаводаў, прынялі наступную пастанову:

«Ухваліць пачынанні перадавых лесапільных і дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў Беларусі ў арганізацыі стаханаўскай дэкады.

Прапанаваць усім трастам, абласным і краявым камітэтам саюза, дырэктарам і заўкомам прадпрыемстваў абмеркаваць выклік прадпрыемстваў Беларусі.

Лічыць неабходным правядзенне па ўсіх прадпрыемствах Галоўлесдрэва стаханаўскай дэкады з 7 лютага. Галоўнай задачай усіх кіраўнікоў трэста і прадпрыемстваў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і прафарганізацый з'яўляецца не толькі замацаванне ўжо дасягнутых у стаханаўскія змены і суткі рэзультатаў, але і да пераважнасці знішчэнне ўсіх выяўленых у гэты час непаладак.

Асудзіць практыку работы тых прадпрыемстваў, якія не замацавалі рэзультатаў праведзеных стаханаўскіх сутак і ў наступныя дні працуюць больш нізкімі вытворчымі паказальнікамі. Падобная арганізацыя работы сведчыць аб штурмоўшчыне, зусім недапушчальнай у правядзенні стаханаўскіх сутак, пяцідневак і дэкад.

Дэтальны план правядзення дэкадніка павінен быць загадзя абмеркаваны на агульнаводскай вытворчай нарадзе інжынерна-тэхнічных работнікаў да кіраўнікоў брыгад уключна, а потым — на зменных і дэхавых вытворчых нарадах.

Абласныя, краявыя і заводскія камітэты саюза павінны правесці шырокую масавую работу сярод рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў па падрыхтоўцы да стаханаўскай дэкады, склікаючы вытворчыя нарады найбольш вядучых прафесій (рамшчыкі, абрэзчыкі і інш.).

Звярнуць асаблівую ўвагу на паляпшэнне культурна-бытавога абслугоўвання стаханаўцаў».

УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА СТУДЭНТАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 27 студзеня. У Польшчы адбылася ўсеагульная забастоўка студэнтаў, пратэставаўшых супроць высокай платы за права навучання. У забастоўцы прымалі ўдзел студэнты вышэйшых навучальных устаноў Варшавы, Львова, Кракава, Пазнані і Вільні. Баставалі студэнты амаль усіх палітычных напрамкаў. Ініцыятарамі забастоўкі былі левыя студэнцкія арганізацыі.

На мітынгу ў Варшаўскім політэхнічным інстытуце левыя студэнты ўнеслі рэзалюцыю з патрабаваннем знізіць на 50 проц. плату за права навучання, абласці капіталістаў «культурным падаткам» у карысць вучнёўскай моладзі, свабоды слова, сходаў і арганізацый.

У рэзалюцыі, прынятай на мітынгу ў Варшаўскім універсітэце, канстатуецца, што «матэрыяльная незабяспечанасць студэнцкай моладзі прыняла катастрафічныя размеры і прыводзіць да заняпаду польскай навукі і культуры».

Пахаванне англійскага караля

ЛОНДАН, 28 студзеня. (БЕЛТА). Сёння адбылося пахаванне памёршага англійскага караля Георга V. Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, працэсія дзве гадзіны следавала па вуліцах, уздоўж якіх былі расстаўлены 11 тысяч войск. На чале працэсіі ішлі выбраныя часці армії, ваенна-морскага флота і паветраных сіл. За імі следавалі прадстаўнікі замежных армій. Намеснік наркома абароны маршал Совецкага Саюза тав. **Тухачэўскі** ішоў у працэсіі разам з прадстаўнікамі армій іншых дзяржаў. Ззаду членаў каралеўскай сям'і ішлі прадстаўнікі замежных урадаў, у тым ліку народны камісар па замежных справах тав. **Літвінаў** і паўпрэд СССР у Англіі тав. **Майскі**. Ваенны аташэ СССР у Англіі тав. **Путна** таксама прымаў удзел у пахаванні. Труна была адпраўлена поездам у Віндзор, дзе знаходзіцца каралеўскі замак.

У Лондане ў часе пахавальнай працэсіі 7 тыс. чалавек з-за даўкі страцілі прытомнасць.

ГЕРМАНСКІЯ ЎЗБРАЕННІ Ў РЭЙНСКАЙ ДЭМІЛІТАРЫЗАВАНАЙ ЗОНЕ

ПАРЫЖ, 27 студзеня. (БЕЛТА). Газета «Эксцэльсіор» у артыкуле, прысвечаным становішчу ў Рэйнскай дэмілітарызаванай зоне, піша, што Рэйнская зона з'яўляецца дэмілітарызаванай толькі па найменаванню. Артыкул указвае на шматлікія ваенныя пабудовы, у прыватнасці на падвойную лінію аэрадромаў, якія ідуць ад вострава Боркум (у Нямецкім моры) да Фрыдрыхсгафена і Канстанца (гарадоў на германа-швейцарскай граніцы). У Кельхгейме (Баварыя) створан велізарны аэрапорт, які мае бетанірваны падземны ангар.

ЧАРГОВАЕ АНТЫСОВЕЦКАЕ ІНТЭРВ'Ю ГІТЛЕРА

НЬЮ-ЮРК, 26 студзеня. (ТАСС). Тут апублікавана інтэрв'ю берлінскага прадстаўніка амерыканскага агенцтва «Норт-Амерыкен ньюспейпер альянс» з Гітлерам. Інтэрв'ю носіць агрэсіўна-імперыялістычны характар і адзначаецца наглымі антысовецкімі выпадамі.

Гітлер заявіў, што свет падзелен паміж «больш і менш адароными нацыямі», прычым, па яго словах, некаторыя з «больш адароных» нацый адчуваюць недахват рэсурсаў, а «менш адароныя» «уладаюць абшырнымі нявыкарыстанымі тэрыторыямі».

Затым Гітлер перайшоў да антысовецкіх выпадаў. Не праяўляючы ніякай вынаходлівасці, ён звярнуўся да старога і даўно абвергнутага антысовецкага аргумента адносна так званага «совецкага дэмпінга». Совецкі Саюз, заявіў ён, у канцы канцоў навадніць рынкі прамысловымі вырабамі, як гэта робіць у сучасны момант Японія. Апрача таго, Гітлер заявіў: «Комунізм існуе ў СССР таму, што апіраецца на насельніцтва, амаль пазбаўленае патрэб, і распалагае абшырнымі нявыкарыстанымі тэрыторыямі».

Далей Гітлер выступіў супроць версальскага дагавору. Пасля вышэйпрыведзеных агрэсіўных заяў Гітлер стараўся, як звычайна, запэўніць, што Германія не хоча вайны і не імкнецца да захвату тэрыторый.

***

Чарговы антысовецкі выпад Гітлера не вызначаецца ні свежасцю, ні арыгінальнасцю. Затое ён вызначаецца вялікай... смеласцю, каб не сказаць нагласцю. Гэта, з дазволу сказаць, смеласць заключаецца, вядома, не ў тым, што пан Гітлер зварачаецца да збітых і плоскіх аргументаў. Відавочна, у яго проста няма іншага выхаду.

На самой справе, пан Гітлер дазваляе сабе гаварыць аб голадзе ў Маскве. Можна падумаць, што не ў Берліне і іншых германскіх гарадах чаргі за харчамі — штодзённая з'ява. Але пан Гітлер ідзе далей. Ён палохае свет «совецкім дэмпінгам». Гэта заява вельмі дзіўна гучыць у вуснах главы германскага ўрада, які прапанаваў Совецкаму Саюзу крэдыты для расшырэння совецка-германскага гандлю.

Усё гэта можна было-б зразумець, калі-б Гітлер зрабіў сваю заяву якому-небудзь германскаму карэспандэнту. Фашысцкі друк ужо прывык да такіх «ухіленняў ад ісціны». Але Гітлер, відавочна, забыў, ці не ўявіў, што ён дае інтэрв'ю прадстаўніку амерыканскай прэсы, якая Гебельсу (германскаму міністру прапаганды) не падпарадкавана. У амерыканскай прэсе даволі многа інфармацыі і аб харчовым багацці ў Совецкім Саюзе, і аб голадзе ў Германіі, і... аб германскіх спробах арганізаваць дэмпінг.

Антысовецкі выпад Гітлера б'е міма цэлі. Заява Гітлера гучыць смехападобна, а смешнае, гаворыць, забівае.

(«Правда»).

ПЕРАХОД РОТЫ МАНЧЖУРСКІХ САЛДАТ НА СОВЕЦКУЮ ТЭРЫТОРЫЮ

ХАБАРАЎСК, 29 студзеня. (БЕЛТА). Згодна толькі што атрыманага тут паведамлення, сёння раніцой у Градэкоўскім раёне рота манчжурскіх салдат у поўным узбраенні перайшла на совецкую тэрыторыю, папрасіўшы прытулку. Камандзір роты паручык Хоу Дын-ша, па нацыянальнасці манчжур, заявіў, што ў той-жа дзень, 29-га студзеня, яго рота, пратэстуючы супроць японскай акупацыі, паўстала супроць мясцовых японскіх улад, прычым пры адбыўшайся ў сувязі з гэтым сутычцы ў казармах былі забіты 4 японскія афіцэры.

Перайшоўшыя былі неадкладна раззброены і інтэрніраваны ўглыб совецкай тэрыторыі. Усяго перайшло 104 манчжурскіх салдаты і 4 унцерафіцэры пад камандай памянёнага паручыка. У затрыманых адабрана: два ручныя кулямёты, 111 вінтовак, 2 маўзеры, 2 браўнінгі і некаторая колькасць патронаў. Апрача таго, з імі было 9 коней.

Следства прадаўжаецца.

КІТАЙСКАЯ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ЛІЯ ВАРОТ СТАЛІЦЫ ГУЙЧЖОУ

ЛОНДАН, 27 студзеня. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у сувязі з набліжэннем кітайскай Чырвонай армії пад камандаваннем Хо Луна і Сяо Кэ да сталіцы правінцыі Гуйчжоу-Гуйяна ў апошнім стварылася надзвычай напружанае становішча. Пацвярджаючы паведамленне аб заняцці кітайскай чырвонай арміяй горада Вэнань, агенцтва паведамляе, што чакаецца заняцце чырвонымі войскамі другога горада Гуйдыш, за 50 клм. ад Гуйяна. Усё насельніцтва сталіцы і салдаты мабілізаваны на тэрміновую пабудову блакгаўзаў і траншэй вакол Гуйяна. На фронт адпраўлены ўсе годныя к службе салдаты правінцыяльных войск.

Чырвоныя войскі, піша агенцтва, «змятаюць усё на сваім шляху».

КРЫВАВЫЯ СУТЫЧКІ ЧЛЕНАЎ НАРОДНАГА ФРОНТА З ФАШЫСТАМІ

ПАРЫЖ, 28 студзеня. (БЕЛТА). У горадзе Бегар на поўначы Францыі ў часе дэманстрацыі народнага фронта адбыліся сур'ёзныя сутычкі паміж фашысцкай арганізацыяй «сялянскага фронта» і членамі народнага фронта. 40 чалавек ранена, з іх трое цяжка.

ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ РАМЭН РАЛАНА

Прывітанне Рамэн Ралану ад Акадэміі навук

Дарагі таварыш!

Акадэмія Навук СССР шле Вам, свайму ганаровану члену, гарачыя віншаванні па поваду Вашага 70-гадовага юбілею.

У гады вялікіх гістарычных катастроф, калі імперыялізм пагражае гібеллю ўсяму чалавецтву, Вы, будучы адным з самых культурных людзей нашага часу і ідэйным правадыром лепшай часткі інтэлігенцыі, рашуча сталі на бок новага свету, на бок СССР, як надзеі будучага.

Ваша велізарная эрудыцыя, універсальнасць Вашага выдатнага таленту, Ваша глыбокая, сапраўдная чалавечнасць, Ваша вялікае сумленне, Ваша гарачае служэнне социялізму атрымаюць поўнае прызнанне гісторыі.

Мы горача віншуем Вас, жадаем Вам доўгага жыцця, такога-ж глыбокага і плённага, якім яно было да гэтага часу.

Прэзідыум Акадэміі Навук СССР: А. П. КАРПІНСКІ, В. Л. КАМАРОЎ, Г. М. КРЖЫЖАНОЎСКІ, М. П. ГАРБУНОЎ, А. М. ДЭБОРЫН, Э. В. БРЫЦКЕ, Н. І. БУХАРЫН, А. А. БАРЫСЯК, А. Н. ФРУМКІН.

Рамэн Ралану ад Саюза совецкіх пісьменнікаў

Совецкія пісьменнікі далучаюць сёння свой голас да галасоў мільёнаў прыяцеляў, якія святкуюць 70-ю гадавіну Вашага слаўнага натхнёнага і чыстага жыцця.

Ваша імя палкага, мудрага, сапраўды вялікага пісьменніка сёння асабліва з захапленнем і гучна паўтарае наша краіна, якая будуе пад кіраўніцтвам Сталіна той лад чалавечага шчасця, аб якім заўсёды марылі і да якога заўсёды клікалі Вы, сапраўдны інжынер чалавечых душ.

Мы ўшаноўваем у Вашай асобе няўхільнага і мужнага барацьбіта супроць фашызма, супроць тых, хто распальвае вайну, атручваючы душы мас ядамі драпежнага шавінізма, насілля, чалавеканенавісніцтва. Вы ведаеце, што будучае належыць тым, хто, скінуўшы капіталізм, будуе грамадства без эксплаатацыі і прыгнечання чалавека чалавекам.

Мы ганарымся Вамі.

САЮЗ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ.

АБ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Прамова сакратара ЦК ВКП(б) тав. А. А. АНДРЭЕВА на 1-й нарадзе па дзіцячай літаратуры пры ЦК ВЛКСМ 19 студзеня 1936 г.

Вельмі добра зрабіў комсамол, што склікаў нараду па дзіцячай літаратуры. Наспела шмат пытанняў у гэтай рабоце, і гэта нарада, відаць, адыграе пэўную станоўчую ролю ў справе стварэння совецкай дзіцячай літаратуры.

Я хацеў-бы зрабіць некалькі агульных, а затым і некалькі арганізацыйных заўваг, якія неабходна мець на ўвазе пры вырашэнні пытанняў стварэння дзіцячай літаратуры.

Наша большэвіцкая партыя заўсёды надавала вялікае значэнне справе выхавання людзей і культурнай рабоце і дабілася велізарных поспехаў у гэтых адносінах. А цяпер, пасля таго, як наша партыя паспяхова вырашыла карэнныя пытанні: стварэння сваёй магутнай сацыялістычнай прамысловасці і замацавання ў вёсцы калгаснага ладу, пасля таго як мы вышыблі з усіх пазіцый апошнія эксплаататарскія класы і паспяхова гэтыя класы ліквідавалі,— задача сацыялістычнага выхавання і перавыхавання людзей, задача рознабаковай культурнай работы набывае яшчэ большае значэнне. Вы можаце знайсці шматлікія прыклады для пацвярджэння гэтага палажэння ва ўсёй палітыцы і практыцы работы чашай партыі і ўрада, што гэтай справе аддаецца цяпер выключная ўвага.

Асаблівую ўвагу ўдаляе гэтай справе асабіста таварыш Сталін. (Доўгія апладысменты). Ён з асаблівай клапатлівасцю паставіў і ставіць пэлы рад вельмі важных пытанняў у галіне культурнай работы: і па арганізацыі школы, і па стварэнню сапраўдных падручнікаў па ўсіх асноўных галінах ведаў, і па метадах выкладання ў ніжэйшай, сярэдняй і вышэйшай школе, і ў тым ліку і пытанні дзіцячай літаратуры. Надаючы вялікае значэнне дзіцячай літаратуры ў пытаннях выхавання і ведаючы слабасць пастаноўкі яе выдання, таварыш Сталін паставіў пытанне аб перадачы гэтай справы комсамолу, які, несумненна, яе лепш арганізуе. Пацвярджэннем велізарнай увагі партыі і ўрада пытанням культуры з'яўляюцца значныя і з кожным годам узрастаючыя грашовыя асігнаванні.

Другое, што трэба мець на ўвазе, — гэта тое, што наша краіна з кожным годам мяняе свой твар у сэнсе граматнасці. Цяпер мы маем амаль ужо пагалоўную граматнасць насельніцтва па пэламу раду рэспублік, краёў і абласцей. Калі на працягу 1936—37 гг. як след папрацуем над ліквідацыяй няграматнасці астаўшыхся некалькіх мільёнаў чалавек, то ў нашым Совецкім Саюзе зусім ня будзе няграматных. У адносінах дзяцей мы маем ужо зараз пагалоўны ахват іх школьнай вучобай. У нашых школах вучыцца больш 28 млн. дзяцей, у той час як да Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі ў царскіх школах вучылася не больш 8 млн. вучняў.

Усё гэта я гавару к таму, каб паказаць, што для нашай літаратуры, і асабліва для дзіцячай літаратуры, мы маем такі прастор і такія спрыяючыя ўмовы, якіх ніколі наша краіна раней не мела і не мае ні адна капіталістычная краіна.

Гэта абстаноўка амаль пагалоўнай граматнасці насельніцтва і велізарны рост культурных патрэбнасцей нашага рабочага і калгасніка прад'яўляюць і новыя патрабаванні да ўсіх нашых совецкіх пісьменнікаў і мастакоў, на якія трэба адказваць хутчэй і больш высокай якасцю літаратуры.

Не гледзячы на велізарную змену нашай краіны ў бок культурнасці, аднак літаратура наша адстае ад задавалення ўзросшых патрабаванняў, і асабліва адстае дзіцячая літаратура.

Не гледзячы на рост, з года ў год, выдання дзіцячых кніг, — з 10 млн. экз. у 1933 г. да 12 млн. экз. у 1935 г., — аднак, нельга прызнаць здавальняючым становішча з дзіцячай літаратурай хоць-бы ўжо па аднаму таму, што мала яшчэ пішацца і выдаецца дзіцячых кніг. Іх трэба па крайняй меры разоў у 5—10 больш у параўнанні з тым, што выдаецца зараз. Побач з нядрэннымі дзіцячымі кніжкамі, напісанымі радам дзіцячых пісьменнікаў, усё-ж і па якасці наша дзіцячая літаратура мае рад недахопаў. Па-першае, некаторыя ўзросты дзяцей вельмі слаба абслугоўваюцца дзіцячай літаратурай.

Напрыклад, ёсць скаргі на тое, што выдаецца зусім мала кніг для дзяцей узросту окцябрат.

Па-другое, дзіцячая літаратура не ахапляе пэлага раду вельмі важных бакоў нашага жыцця і праходзіць міма раду вельмі важных тэм, якія павінны быць паказаны дзецям у мастацкай форме.

Па-трэцяе, само ўкладанне пісьменнікамі дзіцячай кнігі, мова, стыль часта разыходзяцца з мэтай зацікавіць і быць зразумелай нашым дзецям, не гаворачы ўжо аб тым, што нярэдка проста скажаюць літаратурную мову народу. Такіх кніг, на жаль, яшчэ нямала, хоць іх і становіцца менш.

Рад пісьменнікаў, замест таго, каб вучыцца ў нашых вялікіх мастакоў слова: А. М. Горкага, Пушкіна, Л. Талстога, вучыцца ў вялікіх крытыкаў літаратуры: Бялінскага, Дабралюбава, Чэрнышэўскага і інш., як ствараць дзіцячую кнігу, — прабуюць вылумаць сваё, штосьці асаблівае, і часта не дасягаюць мэты, падносяць дзіцяці дрэнную кніжку, тым самым не знаходзячы водгуку на свае творы ў дзіцячым асяроддзі.

Як ствараць дзіцячую кніжку, многаму вучаць нас нашы класікі — пісьменнікі мінулага стагоддзя. Многаму вучыць у гэтых адносінах велізарны вопыт нашага вялікага пісьменніка Алексея Максімавіча Горкага, многаму вучыць крытыка літаратуры Чэрнышэўскага, Бялінскага, Дабралюбава і інш. Усё гэта, вядома, трэба ведаць і скарыстаць у стварэнні добрай дзіцячай кніжкі і ў нашых совецкіх умовах.

Вось, напрыклад, проста незабыўныя словы Чэрнышэўскага:

«... Сапраўды, мы не заўсёды ўмеем цаніць як належыць, напрыклад, розум дзяцей, — па крайняй меры, мы наогул занадта мала давяраем яму, — мы або мучым яго зацвярджэннем сухіх правіл і мёртвых слоў, сэнсу якіх не тлумачым дзецям, «бо яны яшчэ дзеці, не зразумеюць яны гэтага», або, калі хочам даставіць ім прыемнае чытанне, балбочам з імі аб такіх рэчах і такой мовай, што разумнае дзіця зараз-жа заўважыць у нашых словах прытворнае дзяцінства і будзе падсмейвацца над гэтым нямённым і нудным дзяцінствам. Мы думаем, што дзіцячы рассудак слабы, што дзіцячы розум непранікальны; о, не, наадварот, ён толькі нявопытны, але, паверце, вельмі востры і пранікліва. Бо навучаецца-ж 12-гадовы хлопчык разумець алгебраічныя адцягненасці, якія і дарослому не ўсякаму растлумачыш.

...Так, трэба толькі ўмеючы прыняцца за справу, і з дзецьмі можна гаварыць і аб гісторыі, і аб этычных навуках, і аб літаратуры, так што яны будуць не толькі пазнаваць мёртвыя факты, але і разумець сэнс, сувязь іх. У гэтых адносінах мы наогул не задаволены кнігамі для дзіцячага чытання: яны занадта — выбачайце за выраз — зневажаюць дзяцей недаверчывасцю да іх розуму, адсутнасцю мыслі, прытарнымі сентэнцыямі. У чым гэта наўмысная пустата, праднамеранае ідыёцтва? Дзецям вельмі многае можна растлумачыць вельмі лёгка, толькі-б тлумачальнік сам разумеў ясна прадмет, аб якім узяўся гаварыць з дзецьмі, і ўмеў гаварыць чалавечаю моваю...» (З бібліяграфіі Н. Г. Чэрнышэўскага — **«А. С. Пушкин, его жизнь и сочинения»**).

Злучыце гэтыя мысліі з сучаснымі задачамі, якія вынікаюць з нашага сацыялістычнага ладу, і гэта будзе прамым кіраўніцтвам для ўсіх нашых аўтараў кніг для дзяцей. Ці так справа абстаіць у пэлага раду нашых дзіцячых пісьменнікаў? На жаль, не. Гэтыя недахопы былі адзначаны на данай нарадзе радам выступаўшых удзельнікаў нарады.

Ёсць рад выдатных указанняў Алексея Максімавіча Горкага ў яго артыкулах аб дзіцячай літаратуры — «О безответственных людях и о детской книге наших дней», «Литература детям» і «О темах».

Гэтыя артыкулы неабходна ўсім нашым пісьменнікам, выдаўцам і крытыкам дзіцячай літаратуры чытаць і перачытваць. Гэта дапаможа ім уникнуць усякага роду памылак у галіне дзіцячай літаратуры.

Не задавольвае нас дзіцячая літаратура і па свайму мастацка-тэхнічнаму афармленню. Для дзіцяці-ж і для падростка надзвычай важнае значэнне мае тэхнічнае, мастацкае афармленне кнігі: папера, друк, рысункі. Гэта нярэдка вырашае справу. На падставе афармлення кніжкі ў значнай ступені можна меркаваць, ці прачытае дзіця кнігу, ці не прачытае. У тэхнічных адносінах дзіцячая літаратура стаіць яшчэ на вельмі нізкім узроўні, і вінаваты ў гэтым цалкам выдаўцы, якія па-бюракратычнаму адносяцца да сваёй справы. Друк часта неахайны, папера дрэнная, рысункі таксама нікуды нягодныя. Часам падносяць усякую мазню дзецям і думаюць, што ўсё гэта сыдзе. Некаторыя мастакі-«левакі» нават лічаць такую мазню крокам наперад, замест таго, каб даваць дзецям рэальныя рысункі і карпінкі для таго, каб у дзіцяці з ранняга ўзросту развіваць мастацкае чуццё і густ. Вось бачы це, якія недахопы ўласцівы яшчэ нашай дзіцячай літаратуры.

Чым растлумачыць гэта адставанне дзіцячай літаратуры? Відаць, тым, што, мабыць, дзіцячыя кнігі стварацъ значна трудней, чым кнігі для дарослых. Да аўтара дзіцячай кнігі прад'яўляецца пэлы рад дадатковых патрабаванняў. Аўтар дзіцячай кнігі павінен ведаць дзяцей, каб напісанае было зразумела дзіцяці.

Дзіцячы пісьменнік павінен спалучаць у сваёй творчасці найвялікшую чуласць па дзяцей і не ўпускаць у той-жа час з-пад увагі галоўную мэту — тое, што ён павінен вылажыць у кніжцы.

Але ці ў гэтым яшчэ галоўная перашкода да больш шырокага развіцця дзіцячай літаратуры? Не!

Што-ж яшчэ затрудняе рост дзіцячай літаратуры? Можа быць, мала сродкаў у нашых выдавецтваў, мала паперы, друкарань, літаграфій, фарбаў і т. п.? Што адставанне нашай паліграфіі тармозіць справу, гэта часткова верна, але наўрад ці толькі гэтым можна растлумачыць недахват дзіцячай літаратуры. Можам напэўна і на існуючай тэхнічнай базе, скарыстаўшы яе як след, даць кніг значна больш і значна лепшай якасці. Калі ў чым выдаўцам трэба дапамагчы, няхай яны членападзельна скажуць, у чым іменна, і мы ім дапаможам. Значыць, і не гэта затрымлівае рост дзіцячай літаратуры.

Можа быць, у нас мала дзіцячых пісьменнікаў — тварцоў дзіцячай літаратуры? Не! Пісьменнікаў у нас у СССР ужо нямала. І іх рады будуць усё павялічвацца, трэба толькі іх арганізаваць і правільна іх скарыстаць, прапаваць з імі і над імі. Значыць, і гэта акалічнасць не можа затрымліваць развіцця дзіцячай літаратуры. Галоўнае, што затрудняе рост дзіцячай літаратуры, як відаць, заключаецца ў тым, што да гэтага часу была дрэнная арганізацыя ўсёй справы, справы выдання дзіцячай літаратуры. Калі-б у нас была лепшая арганізацыя ў гэтых адносінах, усе вышэй пералічаныя перашкоды, калі не зусім, то ў значна меншай ступені рабілі-б уплыў на стварэнне совецкай дзіцячай літаратуры. У дзіцячай літаратуры не было да гэтага часу сапраўднага гаспадара. Яна ні Наркаматам асветы, ні выдавецтвамі не была ўзнята на тую вышыню, на якой яна павінна знаходзіцца.

Будзем спадзявацца, што цяпер комсамол справу павядзе па-новаму.

Значыць, задача цяпер заключаецца ў тым, каб узняць становішча дзіцячай літаратуры на большую вышыню, зняць усе і ўсякія перагароды, якія перашкаджаюць яе развіццю. Задача заключаецца ў тым, каб справу стварэння і выдання дзіцячай літаратуры паставіць з большым размахам, адпаведным яе велізарнаму значэнню ў справе ўсебаковага выхавання нашага маладога пакалення. З гэтай мэтай ЦК ВКП(б) і прыняў рашэнне аб перадачы комсамолу дзіцячага выдавецтва, і мы думаем, што комсамол гэту задачу з гонарам выканае.

Косарэў. Пастараемся.

Андрэеў. З чаго нашаму комсамолу трэба было-б пачаць гэту вялікую работу?

Перш за ўсё трэба сабраць і арганізаваць усе наяўныя сілы пісьменнікаў. Трэба вывесці некаторых дзіцячых пісьменнікаў і мастакоў са становішча саматужнікаў-адзіночак, якія нідзе і нешта пішуць, але якія адарваны ад нашай гераічнай рэчаіснасці. Трэба сабраць усё, што ёсць лепшага ў нас у краіне і скарыстаць для дзіцячай літаратуры. Ці трэба абмяжоўвацца толькі колам дзіцячых пісьменнікаў? Не, вядома. Трэба зняць тыя ўмоўныя грані, якія перашкаджаюць пэламу раду нашых відных совецкіх пісьменнікаў пісаць на дзіцячыя тэмы ў літаратуры. Некаторыя нашы відныя совецкія пісьменнікі яўна недаацэньваюць значэнне дзіцячай літаратуры і таму не пішуць для дзяцей, а другія проста пабойваюцца брацца за гэту справу, не давяраючы сваім здольнасцям у гэтай галіне. І тое, і другое павінна быць адкінута. Нашы совецкія пісьменнікі, якія пішуць вялікія рэчы, павінны быць абавязкова прыцягнуты да творчасці і ў галіне дзіцячай літаратуры. Ці можа такі пісьменнік, які бліскуча піша раманы для дарослых чытачоў, стварацъ дзіцячыя расказы ці дзіцячыя аповесці? Безумоўна, можа! Можа быць, не кожны можа спалучаць у сабе гэту якасць, але няправільна было-б гаварыць, што пісьменнік, які піша для дарослых, пазбаўлён магчымасці пісаць для дзяцей. Хіба не даюць нам бліскучыя ўзоры Пушкін, Леў Талстой і інш., напісаўшыя побач з вялікімі сур'ёзнымі раманамі і паэмамі выдатных расказаў і вершаў для дзяцей? Недалёка хадзіць за прыкладам. Вось сучасны пісьменнік Алексей Талстой, які тут сядзіць, напісаў некалькі надзвычай добрых рэчаў і для дзяцей. Трэба прыцягнуць усімі мерамі для стварэння дзіцячай кніжкі ўсіх нашых лепшых пісьменнікаў, паэтаў і драматургаў. Разам з тым трэба сур'ёзна працаваць і над стварэннем кадраў дзіцячых пісьменнікаў, паэтаў і мастакоў.

Зараз усе стваряюць свае кадры: партыя стварае кадры, наркаматы росцяць свае кадры, у сельскай гаспадарцы таксама ствараюцца свае кадры. А вось нашы выдавецтвы, як відаць, думаюць, што пісьменнікі будуць стварацца ці самі па сабе, ці іх будзе рыхтаваць для іх хтосьці іншы, замест таго, каб самім уважліва працаваць над вырошчваннем кожнага пачынаючага пісьменніка ў добрага пісьменніка, усімі мерамі яму ў гэтым дапамагаючы. Толькі так і могуць стварацца кадры, а нашы выдавецтвы бюракратычна адносяцца да гэтай задачы, не разумеючы, што ў гэтым заключаецца асноўная арганізацыйная ўмова для добрай работы выдавецтваў.

Дзіцячая літаратура ў нас будзе безумоўна расці, калі мы забяспечым гэту неабходную арганізацыйную ўмову. Вядомыя словы таварыша Сталіна аб кадрах «**Людзей трэба клапатліва і ўважліва вырошчваць, як садоўнік вырошчвае аблюбаванае пладовае дрэва**», у няменшай меры адносяцца і да выдавецтваў па вырошчванню кадраў нашых совецкіх літаратараў.



Пра літаратурную крытыку

Што яшчэ неабходна для паспяховага росту дзіцячай літаратуры, як і для літаратуры наогул? Крытыка! Не крытыка невуцкая, якая часта не разбіраецца ў сутнасці пытання і гатова за ўсякую аніску, за ўсякую няўдачную фразу маладога пісьменніка абескуражыць. Нярэдка нашы літаратурныя крытыкі, якіх, на жаль, яшчэ вельмі мала, замест чулай і ўважлівай ацэнкі каштоўнасцей і недахопаў таго ці іншага літаратурнага твору, зводзяць справу або да агульнага захвальвання, або агульнага ахайвання. Такая крытыка нам не патрэбна. Нам патрэбна чулая прынцыповая крытыка, якая вучыла-б пісьменніка і заахвочвала-б яго рост, яго рух наперад, ускрываючы сапраўдныя недахопы таго ці іншага літаратурнага твору, у той-жа час ачышчаючы літаратуру ад усякай гнілі, усяго чужога і нездаровага. Ці ёсць у нас такая крытыка нашай літаратуры? Не, яна яшчэ далёка не склалася. Нашы друкаваныя органы — газеты і журналы — вельмі недастаткова аддаюць увагі гэтай важнейшай справе, дый самі пісьменнікі слабавата ў сваім асяроддзі разгортваюць літаратурную самакрытыку. А не трэба-ж забываць, што ўся наша вялікая руская літаратура стваралася на крытыцы Бялінскага, Дабралюбава, Чэрнышэўскага і інш. І нашай совецкай літаратуры трэба забяспечыць сапраўдную кваліфікаваную крытыку, бо яна будзе спрыяць і з'яўляцца адной з неабходнейшых умоў яшчэ большага росквіту совецкай літаратуры, у тым ліку і дзіцячай літаратуры. Дык вось нам неабходна пабольш літаратурнай крытыкі і самакрытыкі.

Трэба пачаць з таго, каб арганізаваць добрыя бібліяграфічныя аддзелы і змяшчэнне крытычных артыкулаў аб дзіцячай літаратуры ва ўсім комсамольскім друку, пачынаючы з «Комсомольской правды», «Молодой гвардии» і інш. Трэба прыцягнуць да літаратурнай крытыкі саміх пісьменнікаў, друкаваць часцей водгукі саміх чытачоў аб кнігах. Так паступова будзе складвацца сур'ёзная крытыка дзіцячай літаратуры. Без гэтай умовы ў нас не будзе добрай дзіцячай літаратуры, і яна будзе мець велізарнейшыя недахопы. Нам трэба ва ўсёй рабоце па стварэнню дзіцячай літаратуры выкрываць і высаняць усё, што хаваецца пад сцягам «усё сыдзе». Мы павінны забяспечыць добрую якасць дзіцячай кніжкі ва ўсіх адносінах. Не толькі крытыка, а і выдавецтвы не павінны прапускаць усё, што не адпавядае задачам сацыялістычнага выхавання дзяцей, усё, што хаваецца пад сцягам «усё сыдзе».

Нельга не сказаць пару слоў па адрасу нашых педагогаў, якія абавязаны ўсімі мерамі дапамагчы развіццю дзіцячай літаратуры і стварэнню добрых кніжак, а тым часам яны яшчэ не вядуць сябе ў гэтай справе з належнай актыўнасцю.

Комсамолу, і ў прыватнасці дзіцячаму выдавецтву, неабходна шырока ўцягнуць лепшых педагогаў ва ўсю работу і па стварэнню дзіцячай літаратуры, і асабліва па частцы яе крытыкі.

Пра мастацкае афармленне дзіцячай кніжкі

У стварэнні дзіцячай кніжкі мае значэнне не толькі пісьменнік, але і мастак. Мастацкае афармленне дзіцячай кнігі за рэдкім выключэннем яшчэ вельмі дрэннае. Гэты бок у нас яўна недамагае. Мы павінны выганяць з дзіцячай літаратуры ўсё тое, што ідзе ў разрэз з развіццём правільнага мастацкага густу дзяцей. Усю гэту мазню, якая не дае ніякага рэальнага ўяўлення аб рэчаіснасці, і ўсе скажэнні ў гэтай галіне трэба з дзіцячай літаратуры бязлітасна выганяць. Няхай такія мастакі малююць свае рысункі для сябе, для свайго ўласнага задавалення, а нашаму дзіцяці мы гэту мазню падносіць не дазволім. Проста моташна і балюча часамі становіцца, калі бярэш дзіцячую кніжку ў рукі з такой мазнёй. Няўжо нашы совецкія мастакі і выдавецтвы не могуць даць нічога лепшага? Не верыцца! Проста спаслі гэту справу да крайняй агіднасці і невуцтва нашы выдавецтвы і некаторыя так званыя мастакі. Комсамол павінен пакончыць з гэтым і павінен стаць на абарону сапраўднага рэалістычнага мастацкага выхавання дзяцей. Ці ёсць у нас добрыя мастакі? Безумоўна, ёсць, іх нямала. Яны прысутнічаюць і тут на нарадзе. Ці можам мы забяспечыць больш высокае мастацкае афармленне дзіцячай кніжкі? Безумоўна, можам! Трэба толькі даць мастакам правільны напрамак, папрацаваць з імі, прад'явіць ім тое, што ад іх патрабуецца. Гэта вельмі важная справа. Трэба, апрача добрага цікавага апавядання ці верша, добра, акуратна зрабіць, надрукаваць кніжку, даць лепшую паперу, добры рысунак і добрую вокладку і пераплёты. Адным словам, трэба кнігу рабіць з любоўю, а не па-бюракратычнаму.

Якія дзіцячыя кнігі нам патрэбны?

План дзіцячага выдавецтва недастаткова ўлічвае ўсе гэтыя моманты. Трэба гэты план сур'ёзна пасля данай нарады паправіць. Трэба, па-першае, сабраць усё, што ёсць лепшага ў сусветнай літаратуры для дзяцей, і зрабіць гэта здабыткам нашых совецкіх дзяцей. (Апладысменты). Нашы выдаўцы яшчэ далёка гэту задачу не выканалі, а ёсць-жа нямала бліскучых твораў у сусветнай літаратуры, якія павінны быць абавязкова перакладзены і выданы ў нас. Занадта шмат дзіцячае выдавецтва намеціла выдаць у прадстаўленым плане класікаў і мала сучасных тэм дзіцячай літаратуры.

Класікі цяпер у нас выдаюцца многімі выдавецтвамі: Літвыдатам, «Академия» і інш. Ці трэба дубліраваць работу другіх выдавецтваў? І ў гэтым сэнсе правільна таварышы адзначалі, што дзіцячае выдавецтва ідзе па лініі найбольшай лёгкасці ў рабоце.

Слаба прадстаўлена ў гэтым плане і тая частка дзіцячай літаратуры, якая датычыць навуковых і тэхнічна-канструкцыйных пытанняў для дзяцей. Да гэтай нарады мне ўдалося азнаёміцца з кніжкамі на замежных мовах. Трэба сказаць, што тэхнічна гэта — выдатна зробленыя кніжкі, дзе даецца дзецям розных узростаў магчымасць развіваць іх тэхнічна-канструктыўныя здольнасці. Мы становімся краінай перадавой тэхнікі, і нам трэба развіваць у нашых дзяцей гэтыя здольнасці. Для гэтага трэба стварыць у гэтай галіне некалькі добрых кніг з вялікім тыражом. З некаторай неабходнай пераапрацоўкай сёе-тое можна перакласці і выдаць і з заграніччных узораў дзіцячай тэхнічнай літаратуры. Гэта будзе вельмі добра.

Трэба абавязкова папоўніць выдавецкі план дзіцячага выдавецтва выданнем кніжак па пытаннях, што з сябе прадстаўляе наша вялікая радзіма ва ўсіх яе галінах. Дзеці перш за ўсё павінны ведаць, што наша краіна мае, якія ў яе багацці, чым яна адрозніваецца ад іншых краін. Такіх кніжак для дзяцей у нас яшчэ вельмі мала.

Неабходна таксама ў мастацкай форме паказваць, што было і што стала з нашай краінай, чаго ў нас не было і што цяпер ёсць. Гэта вельмі багатая тэма для творчасці пісьменнікаў. У нас яшчэ не створана пісьменнікамі простых, але цікава складзеных біяграфій вялікіх людзей навукі і літаратуры. Няма, на жаль, да гэтага часу для дзяцей добрых біяграфій Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. А ўсё гэта надзвычай неабходна для сацыялістычнага выхавання дзяцей праз мастацкую літаратуру. У нас нямала ўжо ёсць бліскучых узораў нацыянальнай літаратуры украінскай, грузінскай і іншых нашых нацыянальных рэспублік і абласцей. Трэба іх сістэматычна перакладаць на рускую мову і перавыдаваць дзіцячаму выдавецтву.

Вось чым трэба-б было папоўніць і ў якім сэнсе трэба змяніць абмяркоўваемы вамі выдавецкі план дзіцячай літаратуры. Трэба ўсю справу паставіць такім чынам, каб 1936 г. быў-бы пераломным годам у стварэнні добрай совецкай дзіцячай літаратуры.

Мы абавязаны і можам стварыць усебаковую, добрую і цікавую літаратуру для нашых дзяцей.

Дазвольце выказаць упэўненасць, што комсамол, які нямала ў сваёй рабоце атрымаў перамог, будучы верным памочнікам нашай вялікай комуністычнай партыі большэвікоў, з гонарам выканае і гэту задачу (**Бурныя апладысменты. Усе ўстаюць і вітаюць тав. Андрэева**).

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПА УРАДЖАЙНАСЦІ

Прамова тав. ГОЛУБА Я. Т.

(БРЫГАДЗІР КАЛГАСА «ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН» № 1, БАБРУЙСКАГА РАЁНА)

Таварышы! Ад імя калгаснікаў і калгасніц Бабруйскага раёна дазвольце перадаць палкае большэвіцкае прывітанне нашаму лепшаму другу таварышу **Сталіну (апладысменты)**, кіраўнікам ордэнаноснай Совецкай Беларусі тт. Гікало, Галадзеду і Чарвякову **(апладысменты)** і лепшым калгаснікам, калгасніцам, лепшым майстрам калгасных палёў **(апладысменты)**.

Таварышы! Мы прыехалі сюды для таго, каб падзяліцца вопытам сваёй работы, абмеркаваць, як мы будзем працаваць сёлета.

У мінулым годзе мы знялі з 15 гектараў бульбы па 1.200 пудоў, ячменю з 5 гектараў па 115 пудоў, аўса з 3 гектараў па 103 пуды з кожнага. У гэтым годзе мы намячаем атрымаць ураджай па зярну 14 цэнтнераў з гектара ў сярэднім па калгасу, а на асобных участках па 20 цэнтнераў. Па бульбе — 1.700 пудоў з гектара ў сярэднім па калгасу, а на асобных участках па 3 тысячы пудоў **(апладысменты)**.

Для таго, каб атрымаць такі ўраджай, мы на агульным сходзе калгаса рашылі вывезці 6.000 тон торфу. 2.500 тон мы ўжо вывезлі і закампаставалі ў кучы папалам з гноем. Мая брыгада сабрала паўтары тоны попелу і паўтары тоны курынага памёту. Мы рашылі таксама вывезці іл, які ёсць на палях у так званых сажалках. Праверка паказала, што прымяненне ілу на ўгнаенне дае вялікія вынікі ў павышэнні ўраджайнасці. Вясной, калі растане снег, мы будзем баранаваць у адзін след жыта і пасеем мінеральнае ўгнаенне па 2 цнт. на гектар. Для аўладання агратэхнікай мы

арганізавалі аграгурток, арганізуем хату-лабараторыю.

Таварышы! Мы павінны працаваць так, як працуе таварыш Стаханаў, як працуе Марыя Дземчэнка і інш. І тады мы дзь'емся высокіх ураджаяў не за чатыры гады, а за 2—3 гады.

Няхай жыве наш лепшы друг і настаўнік працоўных, які даў нам вясёлае, заможнае і шчаслівае жыццё, таварыш Сталін! **(Апладысменты)**.

Няхай жывуць кіраўнікі Беларусі — ордэнаносцы таварышы Гікало, Галадзед і таварыш Чарвякоў! **(Апладысменты)**.

Няхай жывуць нашы лепшыя калгасніцы і калгаснікі ўдарнікі калгасных палёў! **(Апладысменты)**.

Прамова тав. ЗАЙЦАВА Ф. І.

(СТАРШЫНЯ КАЛГАСА «ПЕРАМОГА», ТАЛАЧЫНСКАГА РАЁНА)

Таварышы, дазвольце перадаць ад імя калгаснікаў і калгасніц Талачынскага раёна палкае прывітанне перадавікам ураджайнасці ордэнаноснай БССР, кіраўнікам КП(б)Б і ўрада — таварышам Гікало, Галадзеду і Чарвякову. **(Апладысменты)**.

Тут мала гаварылі аб такой важнай культуры, як лён. У нашым калгасе «Перамога» было засеяна 66 гектараў ільну. Лён у нас атрымаўся лепшы ў раёне, валакно сярэднім нумарам 13 і 4 цэнтн. 20 кілограмаў з гектара; мы таксама атрымалі па 4,3 цнт. ільносемя. У гэтым годзе мы паставілі перад сабой канкрэтную задачу — атрымаць з гектара не менш 6 цэнтнераў валакна і 6 цэнтнераў ільносемя.

У БССР і ў нашым раёне ёсць добрыя калгасы, якія не паважаюць лён, сеюць яго на дрэнна апрацаваных і дрэнна ўгноеных землях. З гэтай трыбуны сёння гаварылі некаторыя, што атрымалі з гектара толькі 2 цэнтнеры валакна. Самі вінаваты. Мы лён паважаем, бо ён падымае кошт працадня калгасніка, і таму ён у нас расце добра. Мы атрымалі за лён 45 тысяч рублёў **(апладысменты)**. Але нас і бульба не пакрыўдзіла. Мы пасеялі 41 гектар бульбы і ўзялі ў сярэднім з кожнага гектара па тысячы пудоў, а з 5 гектараў вопытнага ўчастка—па 1.500 пудоў.

У 1935 годзе калгаснікі ў нас атрымалі на працадзень 2 кілограмы зернавых, 13 кілограмаў бульбы і 1 рубель грашыма. Калгаснік Купрыянец Якаў атрымаў 731 пуд бульбы, 89 пудоў зернавых і 732 рублі грашыма. На двор калгасніка Палаткі Макея прыпалося бульбы 709 пудоў, зернавых 120 пудоў і 1.019 рублёў грашыма.

Сёння я з вялікай радасцю тут выступаю. Я многа перажыў, асабліва ў 1933 г., калі наш раён быў на чорнай дошцы. Мне крыўдна было. Мой калгас і тады быў не дрэнны, а я за іншых таксама папляціўся. Я гэта вельмі добра памятаю. Сёння наш раён перадавы. У гэтым перадавым раёне наш калгас бярэ на сябе абавязацельства ўпесь час быць перадавым. Мы выклікаем на сацыялістычнае спаборніцтва Круглянскі раён па наступных паказальніках: атрымаць з гектара ільновалакна 6 цэнтнераў, ільносемя — 6 цэнтнераў, зернавых — 17 цэнтнераў і бульбы 1.500 пудоў. **(Апладысменты)**. Згодны, круглянцы?

Голас з месца: — Згодны.

— Я канчаю. Дзякуй за вясёлае заможнае жыццё нашаму вялікаму правадыру, лепшаму калгаснику таварышу Сталіну. **(Апладысменты)**.

Партыйнае будаўніцтва

На чале выдатнага руху мас

Раніцай 6 кастрычніка 1935 года парторг другой групы першага машыннага цэха фабрыкі імя Кагановіча т. Галубіцкі прачытаў «Правде», што рабочы ленінградскай фабрыкі «Скороход» Сметанін на абцяжнай машыне зрабіў 1.460 пар абутку, пры норме 655 пар. У «Правде» быў змешчан малюнак машыны і падрабязна апісана, як Сметанін апрацаваў старую норму.

«У чым справа, — падумаў Галубіцкі, — машыны ў нас такія самыя, чаму мы не можам узяць рэкорд Сметаніна?» Галубіцкі пашоў да лепшых ударнікаў сваёй змены, братам Скабло, і паказаў ім газету «Правда» з апісаннем рэкорду Сметаніна. Браты абяцалі падумаць.

З тым-жа пытаннем звярнуўся Галубіцкі да начальніка цэха комуніста Альбуха. Назаўтра была склікана нарада: начальнік цэха, начальнік змены, парторг і браты Скабло. Дагаварыліся аб падрабязнасцях пераходу на стаханаўска-сметанінскі метад і прыступілі да работы. Гэта было 9 кастрычніка. К абедзенаму перапынку стала ясна, што перамога забяспечана. Парторг зразумеў, што іскра стаханаўскага руху разгарэлася, і пачаў раздуваць яе ў полымя. Адразу-ж быў скліканы мітынг рабочых змены. Першымі адгукнуліся комуністы. На мітынгу комуніст Ліпкінд, а за ім комсамолкі Маляўская і Дуброва, далі слова, што стануць стаханаўцамі. Праз два дні слова было выканана.

10 кастрычніка Галубіцкі навёў перагаворы з старым рабочым Розенбергам, паставіўшы перад ім пытанне так: малодшы Скабло мае вытворчы стаж на тры гады меншы, чым Розенберг. Чаму Скабло стаханавец, а Розенберг не? Розенберг прад'явіў рад патрабаванняў. Яны былі абгаворваны з начальнікам цэха і змены і былі задаволены. Следам за братамі Скабло стаханаўцам стаў Розенберг.

Пасля абгаварэння пытання стаханаўскага руху на сходзе партгрупы з удзелам рабочых уся брыгада братоў Скабло стала стаханаўскай. Замест 6 рабочых сталі працаваць 4, а план выконваўся на 300 і больш процантаў.

Кожны новы рэкорд стаханаўцаў станавіўся зараз-жа вядомым усім рабочым праз мітынгі, гутаркі, пры дапамозе плакатаў, газеты і т. д. Кожны новы поспех быў тэмай для асабістых гутарак парторга з лепшымі рабочымі. Так ён дзень за днём пашыраў рады стаханаўцаў.

У першыя-ж дні стаханаўкай стала **Спектар**, якая выконвае зараз адна работу, патрабаваўшую раней дваіх; Чайкоўская, якая перайшла на абслугоўванне двух гладзільных машын і трымае ўсесаюзны рэкорд. Такіх прыкладаў можна прывесці мноства.

Прамова таварыша **Сталіна** была рашаючым момантам у развязванні стаханаўскага руху на фабрыцы імя Кагановіча. Пасля гэтай прамовы стаханаўцаў сталі лічыць дзесяткамі, а потым і сотнямі. Карэнным чынам змяніўся і змест партыйнай работы т. Галубіцкага. Ён зразумеў, што трэба нястомна ўзнімаць саміх стаханаўцаў усё вышэй і вышэй, узнімаць іх палітычны і тэхнічны ўзровень, трэба каб яны самі прапагандавалі стаханаўскі рух.

Зараз Г. Скабло — агітатар брыгады і прафорг. З. Скабло — старшы брыгадзір. Абодва яны разам з групай іншых стаханаўцаў займаюцца на курсах па ўзняццю кваліфікацыі гаспадарнікаў. Да іх прымацаваны настаўнікі, і парторг уважліва сочыць за тым, каб вучоба ішла паспяхова. З таго часу як кандыдат партыі Ліпкінд стаў стаханаўцам, ён стаў значна актыўнейшым. У мінулым годзе ён адставаў у партыйнай вучобе, а ў гэтым годзе адзін з найбольш паспяваючых, і ўжо здолеў зрабіць цікавы даклад на сходзе партыйнай групы.

Вечары са стаханаўцамі, штодзённыя гутаркі, наведванні на даму — усё гэта стала пастаянным і верным метадам работы Галубіцкага. Рэзультаты атрымаліся добрыя. Браты Скабло і Розенберг падалі заявы і прыняты ў групу спачуваючых.

На сваім месцы аказаўся парторг, калі класавы вораг паспрабаваў сарваць яшчэ малады стаханаўскі рух на фабрыцы. Было так. Рабочы Антоненка даў усесаюзны рэкорд на прашывачнай машыне, зрабіўшы звыш 1.000 пар пры норме 360. Майстар участка Булкін усяляк перашкаджаў Антоненку працаваць, прыдзіраўся да яго з-за кожнай дробязі. Калі гэта не дапамагло, Булкін заявіў, што Антоненка дае суцэльны брак.

Галубіцкі зараз-жа ўмяшаўся ў гэту справу. Устанавіўшы, што якасць добрая, ён тут-жа выкрыў Булкіна, як зрыўшчыка стаханаўскага руху. Булкін быў зняты з работы. Рабочыя віталі гэта рашэнне і рэзка асудзілі класава-варожую вылазку.

Так большэвіцкая пільнасць дапамагла своечасова выкрыць ворага і выкінуць яго з фабрыкі.

Пастаянная кіпучая дзейнасць не перашкаджае т. Галубіцкаму вучыцца ў вячэрнім комвузе на другім курсе, рэгулярна чытаць «Правду», журналы «Партработник», «Спутник агитатора». Гэта дапамагло яму выпрацаваць баявы, аператыўны стыль работы, гэта зрабіла яго прыкладным парторгам. Не выпадкова стаханаўскі рух па фабрыцы імя Кагановіча пачаўся іменна на ўчастку Галубіцкага. Адсюль ён шырокай хваляй разліўся па ўсёй фабрыцы.

ПУКШАНСКАЯ.

ПАСТАНОВАЙ ПАРТКАЛЕГІІ КАМІСІІ ПАРТЫЙНАГА КАНТРОЛЮ ПРЫ ЦК ВКП(б)—

Літвінаў Георгій Васільевіч, год нараджэння 1906, член ВКП(б) з 1932 г. (партыйны білет № 2536295), рабочы, у момант узнікнення справы працаваў у Ояцкай райспажыўчай касе, у сучасны момант бухгалтар саўгаса Гаршчаўшчыны, Талачынскага раёна, — за самавольны ўход з работы і дыверсіі ў раёна з радоўі партыі **выключан.**

Парткалегія КПК па БССР.

Каштоўная ініцыятыва

МАГІЛЕЎ. **(Кар. «Звязды»).** 21 студзеня на скурзаводзе імя Сталіна пачалася стаханаўская дэкада. У першы дзень план выканан на 189 проц. Мяздрылышчык **Мядзведзеў** павялічыў сваю прадукцыйнасць у чатыры разы і зусім ліквідаваў брак. Брыгада стругальщікаў знізіла брак да 0,2 проц. Рэйкаўшчык **Барада** выканаў сваю норму на 361 проц., стругальшчык **Міхайлеўскі** прапусціў за змену 500 скур замест 90 па норме.

26 студзеня на заводзе адбылася вытворчая нарада стаханаўцаў. Адзін за другім выступалі рабочыя і расказвалі аб сваіх поспехах. Рабочы зольнага цэха **Калеснікаў** расказаў аб сваім вынаходстве. На заводзе шчапіна ўвесь час вырывалася са скур рукамі. Калеснікаў сканструяваў машыну, якая механічна вырывае шчапіну. Ён таксама ўдасканаліў шэрсцегонную машыну, што значна павялічыла яе прадукцыйнасць.

Гаварылі і аб непаладках у цэхах. Бываюць выпадкі, калі стаханаўцы прастойваюць па дзве гадзіны і больш без работы.

На заводзе створан інстытут тэхнічных інструктароў. Лепшыя стаханаўцы — **Мядзведзеў, Калеснікаў і Барада** рыхтуюцца да паступлення ў Прамысловую акадэмію.

Зараз на прадпрыемстве пачалася падрыхтоўчая работа да перагляду тэхнічных норм. Створаны брыгады з інжынерна-тэхнічных работнікаў і лепшых стаханаўцаў.

Д. МАЛЕВІЧ.

СТАХАНАЎСКАЯ ДЭКАДА

БАРЫСАЎ. **(Па тэлефону ад кар. «Звязды»).**

25 студзеня на камбінаце «Комінтэрн» пачалася стаханаўская дэкада. У першыя тры дні камбінат выканаў свой план на 111—122 проц. Стаханаўцы токары **Чарнуха, Танкавец** і **Паўлоўскі** выколваюць штодзённа свае нормы на 400 проц., стаханаўка **Бродская** — на 230 проц.

***

20 студзеня пачалася стаханаўская дэкада на шклозаводзе імя Домбаля. Кожная змена ў сярэднім дае штодзённа па 134—150 проц. плана. Стаханавец **Шумскі** на шліфоўцы шклянак выконвае сваю норму на 247 проц. і зарабляе па 20 руб. у дзень.

***

27 студзеня, у першы дзень стаханаўскай пяцідзённкі па лесу ў Барысаўскім раёне, выехала 2.057 возчыкаў, якія вывезлі за гэты дзень 4.500 кубаметраў лесаматэрыялу, 869 лесарубаў у сярэднім загатовілі па 6 кубаметраў кожны (норма 3,5 кубаметра). Брыгада **Кандратовіча** ўчатырох загатовіла 110 кубаметраў драўніны, 52 лесарубы Слабадскога лесаўчастка загатовілі па 60 кубаметраў кожны. Лесаруб **Сінян** са сваёй жонкай Вольгай загатовіў 40 кубаметраў. Вадзіцель машыны **Чуй** выканаў сваю норму на 288 проц.

Члены бюро Барысаўскага райкома партыі выехалі на лесаўчасткі.

В. КАТКЕВІЧ.

ВІЦЕБСК, 28 студзеня. **(Кар. «Звязды»).** На скурзаводзе імя Еўсцігнеева падведзены вынікі першых пяці дзён стаханаўскай дэкады. Промфінплан за гэтыя дні завод выканаў на 128,3 проц., пры паяўнасці рабочай сілы 93,3 проц. супроць плана. У сярэднім прадукцыйнасць працы кожнага рабочага дасягнула 148,4 проц. Прадукцыя першага гатунку складае 103 проц. плана.

За пяць дзён зэканомлена 4.708 кілограмаў сыравіны.

За дні стаханаўскай дэкады рабочыя ўнеслі 16 рацыяналізатарскіх прапаноў, з якіх 12 прыняты і 4 ужо рэалізаваны. Па папярэдніх падліках, ад унесеных прапаноў прадпрыемства будзе мець 9 тыс. рублёў эканоміі за год.

ВЫКАНАЛІ МЕСЯЧНЫ ПЛАН

На аснове разгортвання стаханаўскіх пяцідзевак і дэкады, абутковая фабрыка імя Кагановіча 29 студзеня да тэрміну выканала месячны план. Усяго выпушчана 142.000 пар абутку — на 5.500 пар больш, чым у снежні 1935 г. Зэканомлена 100.000 дэцыметраў верхняга скуранога тавару. К канцу месяца фабрыка выпусціць звыш плана яшчэ 11.400 пар абутку.

Трыкутнік фабрыкі:

КЛІОРЫН, ГЕФЕН, ПАЎЛАЎ.

На Ленінскім нафтапромысле (Баку) адкрыта школа стаханаўцаў. У школу запісалася 40 чалавек свідравальшчыкаў нафты і свідравальных майстроў. Выкладчыкамі запрошаны знатныя майстры-стаханаўцы па свідраванню.

НА ЗДЫМКУ (злева направа): выкладчыкі школы — знатныя майстры свідравання, стаханаўцы Бухаў А. Е., Парфёнаў З. В. рыхтуюцца да правядзення заняткаў.

Фото ТАБАЧКОВА (Саюзфото).



Стаханаўскія змены ў інструментальна-механічным цэху харкаўскага электрамеханічнага завода далі выдатныя рэзультаты. Заданні ў асобныя змены (5 студзеня) выконваліся на 300—330 проц.

НА ЗДЫМКУ: фрэзероўшчыца М. Д. Кальніцкая за фрэзероўкай дэталі. (Тав. Кальніцкая за стаханаўскую змену задание выканала на 471 проц. і без браку).

Фото Я. САПОЖНІКАВА (Саюзфото).

НА ПАБУДОВЕ ПАЛАЦА ПІОНЕРАЎ І ОКЦЯБРАТ

Спалучыць тэмпы з якасцю работ

Кожны дзень работы будаўнікоў усё больш і больш дае магчымасць уявіць сабе ўсю веліч, прыгожасць і хараство палаца для нашай шчаслівай дзетвары. Нельга без гордасці і радасці за нашых дзяцей прайсці міма, на першы погляд, досыць празаічнай рэчы, як тынкоўка. Тут яна робіцца «па маяках» і «пад суконку». Гэта ідэальна роўныя, нібы паліраваныя, паверхні, акаймлёныя раскошнымі, арыгінальнымі карнізамі, якія робяцца ў кожным пакоі па рознаму шаблону.

На эскізах энтузіяста пабудовы архітэктара Воінава брыгада маладых стаханаўцаў Рудзевіцкага паказвае прыклады найлепшай якасці тынкоўкі і выконвае штодзённа нормы на 220—250 процантаў.

У Менску яшчэ такой тынкоўкі да гэтага часу не рабілі.

У аркестравай студыі праектуецца карніз... гармонікам. Як гэта ўдасца будаўнікам, пакажуць бліжэйшыя дні. Але гэты факт сам па сабе красамоўна сведчыць аб тым, што людзі, якім даручана такая адказная і пачэсная справа, імкнуцца стварыць сапраўды пудоўны палац.

На жаль, не аб усіх работніках пабудовы гэта можна сказаць. Зусім дрэнна забяспечваецца пабудова матэрыяламі.

Калі якасць работы па ўсіх элементах выклікае захапленне, то невыкананне графіка яводзіць сум.

Калі нават паверыць прарабу тав. Гантману, то па тынкоўцы адсталі ад плана на 20—25 проц. Прычым, дакладнай лічбы Гантман даць не мог. Прычына адставання — доўга не было алебастру. Прыходзілася тынкавацъ з цэментам, а гэта патрабуе больш часу на сушку.

Для тынкоўкі глядзельнай і спартыўнай зал усё падрыхтавана, нават і рыштаванні. Не хапае толькі эскізных праектаў афармлення гэтых памяшканняў.

Сталярныя работы напярэдадні спынення. Усе дзверы, агарожа радыятараў, бар'еры (у буфеце і вешалках), поручні ў лесвічных клетках павінны быць зроблены з высокаякаснага натуральнага дуба. Гэта даволі вялікая работа, якая ўжо даўно павінна была пачацца. Дуба ў патрэбнай колькасці на пабудове ёсць, але ён сыры. І вось больш месяца, як намеснік начальніка пабудовы па матэрыяльнаму забеспячэнню тав. **Гурвіч** не можа дабіцца дазволу высушыць гэты матэрыял на адной з менскіх сушылак.

Тав. Гурвіч спасылаецца на тое, што ні завод імя Молатава, ні завод стандартных дамоў, ні іншыя прадпрыемствы, якія маюць сушылкі, не жадаюць дапамагчы...

Нарэшце «ўважлівы» спасылкі Гурвіча, сведчыць наступны факт: Гурвіч скардзіўся на тое, што няма дзе дастаць чорнага дуба на пражылкі для паркета. Праўда, некаторыя л'ткі чорнага дуба ёсць на пабудове ДКА, але «там не даюць». Аказваецца, што чорны дуб не такі ўжо дэфіцытны матэрыял і пры праяўленні належнай аператыўнасці яго даўно можна было дастаць. Больш таго, кіраўніцтва пабудовы ДКА зараз згадзілася ўступіць некаторую колькасць чорнага дуба. Мы гаворым «зараз», бо раней ніхто нават і не звяртаўся па гэтаму пытанню да кіраўніка пабудовы.

Трэба адзначыць, што Дзяржплан (адказны тав. Штыфман) вельмі мала дапамагае ў пабудове палаца.

Высокая якасць работы павінна быць спалучана з тэмпамі, якія-б забяспечылі скарачэнне пабудовы да вызначанага тэрміну.

Я. РУБЕНЧЫК.

Пуцёўка ў новае жыццё

Вялікую работу па перавыхаванню няпоўнагадовых злачынцаў праводзіць віцебская працоўная калонія НКУС.

Галоўнай зброяй перавыхавання з'яўляецца праца. Дыферэнцыяваны падыход да кожнага ў паасобку, выключна чулая ўвага — гэтым прышчапляецца былым злачынцам любоў да сацыялістычнай працы, да аховы сацыялістычнай уласнасці.

Пры калоніі ёсць ложкавая фабрыка з ліцейным, такарным, слясарным і сталярным цэхамі. У ёй штодзённа працуе большасць выхаванцаў (каля 300 чал.), якія набываюць паўную кваліфікацыю. Тут прывучаюць іх да працоўнай дысцыпліны, да культуры працы.

На вытворчасці выхаванцы заняты 6 гадзін. Астатні час дня застаецца ім для вучобы і адпачынку. Моладзь дарослыя выхаванцы займаюцца на вячэрніх рабфаках, астатнія наведваюць школу. Так, напрыклад, Мукасей вучыцца ў завочным рабфаку пры ленінградскім інстытуце інжынераў транспарту, Спенаў наведвае курсы шофераў, Старавойтаў займаецца на 2-месячных курсах пры політэхнікуме і т. д.

Добра арганізован адпачынак выхаванцаў. З вялікай ахвотай займаюцца яны ў шматлікіх гуртках, арганізаваных пры калоніі.

Пры калоніі пабудован клуб на 500 чал. Ёсць бібліятэка з рознастайнай літаратурай.

Чыстата і парадак пануюць у інтэрнаце. Ложкі засланы чыстымі белымі навалачкамі і прасцінамі. За парадкам сочаць самі выхаванцы.

Гэтымі днямі адкрываецца новая, прасторная, светлая сталовая. Закуплены вазоны і кветкі.

Нядаўна ў калоніі адбылася вялікая ўрачыстасць. Калонія дала краіне першыя плады сваёй работы — выпусціла 20 былых злачынцаў, якія сталі роўнапраўнымі грамадзянамі Совецкага Саюза.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.
ІЦЫГІН.

Аб будаўніцтве і вытворчасці будматэрыялаў

А. ЛЮБОВІЧ

Старшыня Дзяржплана БССР.

«Самым галоўным недахопам у будаўніцтве трэба прызнаць прымітыўнасці адносіны многіх кіраўнікоў да невыканання ўстаноўленых планаў і асабліва, да зрыву ўстаноўленага кошту будаўніцтва. Калі на фабрыках і заводах выкананне вытворчых планаў і ўстаноўленага сабекошту стала, можна сказаць, цвёрдым законам, то ў будаўніцтве гэтага мы яшчэ не забяспечылі».

Так завострана паставіў пытанне аб будаўніцтве т. **Молатаў** на першай усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў, указваючы «што ў будаўнічай справе стаханаўскі рух павінен адыграць велізарную аднаўляючую ролю».

Пасля нарады па будаўніцтву пры ЦК ВКП(б), на якой пытанні будаўніцтва і вытворчасці будматэрыялаў у дакладах і выступленнях тт. **Молатава, Кагановіча, Орджанікідзе, Хрушчова, Межлаука** былі пастаўлены ва ўвесь рост, пачалося разгортванне стаханаўскага руху на будоўлях. Сяжаньскі пленум ЦК ВКП(б) у сваіх важнейшых рашэннях па пытаннях прамысловасці і транспарту ў сувязі з стаханаўскім рухам уключыў будаўніцтва і вытворчасць будматэрыялаў у лік тых галін пяжкай прамысловасці, дзе павінен быць разгорнут ва ўсю стаханаўскі рух. Па гэтай-жа пастанове на прадпрыемствах, якія выпускаюць будаўнічыя матэрыялы, а таксама па будаўнічых механізмах, павінны быць у 1936 годзе перагледжаны тэхнічныя нормы абсталявання і вытворчых магутнасцей.

«У аснову перагляду праектных магутнасцей пакласці новыя, павышаныя тэхнічныя нормы. Гэтыя тэхнічныя нормы, якія вызначаюць магутнасці асобных агрэгатаў абсталявання, складаць на аснове праверанага вопыта лепшых стаханаўцаў». Так гаворыць пастанова пленума ЦК ВКП(б), якая патрабуе «пайсці ў нагу з стаханаўскім рухам, узначаліць яго і дапамагчы яму стварыць новую, вышэйшую ў параўнанні з капіталізмам, прадукцыйнасць працы».

Яркія, паказальныя прыклады велізарнай ролі стаханаўскага руху на будоўлях і на прадпрыемствах БССР, выпускаючых будматэрыялы, даны былі на нарадзе па будаўніцтву, скліканай ЦК КП(б)Б. Не гледзячы на тое, што стаханаўскі рух у гэтай галіне прамысловасці толькі пачаўся, ён ужо выявіў вялікія вытворчыя магутнасці, якія ляжалі да гэтага часу пад спудам нявыкарыстанымі, у асаблівасці на цагельных заводах, на будоўлях, дзе стаханаўцы — каменшчыкі, цесляры, тынкоўшчыкі даюць велізарнае перавыкананне норм, у выніку новай, навуковай па сутнасці, арганізацыі сваёй работы, рабочага месца, новых тэхнічных прыёмаў.

Да стаханаўскага руху на будоўлях БССР большай часткай не выконваліся нават традыцыйныя нормы ўкладкі цэглы — 1300 штук. Укладка 700—800 штук было звычайнай з'явай для сезоннага, у большай частцы, рабочага. Цяпер стаханаўцы ў сярэднім укладуць 5—6 тысяч, а некаторыя нават 20 тысяч. Тое-ж і ў тынкоўшчыкаў, дзе ёсць перавыкананне нормы на 600—700 проц. На цагельных заводах прэсы замест 18 тысяч штук цэглін за змену пачалі даваць 26—27 тысяч. Сушка цэглы рабілася на працягу 4—6 дзён, а стаханаўцы зараз дабіліся сушэння за два дні. На тыхжа заводах з тым-жа абсталяваннем, але пры стаханаўскіх метадах работы, рэзка павысілася прадукцыйнасць асобных агрэгатаў. А на будоўлях — у першую чаргу тых, дзе склаліся кадры пастаянных рабочых (як, напрыклад, на будоўлі Вялікага тэатра) — не толькі рэзка павялічылася прадукцыйнасць працы, але і тэмпы выканання ўсяго будаўніцтва сталі больш высокімі, а каштаваць стала менш, не гледзячы на тое, што зімовыя работы лічаць звычайна больш дарагімі. На справе даказана магчымасць круглагадавых работ і, значыць, пастаянных кадраў у будаўніцтве.

Моцна адстае ў БССР арганізацыя будаўніцтва, пачынаючы з складання праектаў і канчаючы кіраўніцтвам на будаўнічай пляцоўцы.

Далёка яшчэ няма «пафасу асваення новай тэхнікі ў нашым будаўніцтве», няма пафасу «асваення машын і механізмаў», на што, як на галоўную нашу задачу, указвалі тт. **Сталін** і **Молатаў** на нарадзе па будаўніцтву. Калі, дзякуючы стаханаўскаму руху, дасягнуты ўжо высокія нормы скарыстання асобных агрэгатаў на цагельных заводах, то ўся арганізацыя вытворчасці і яе планаванне знаходзяцца на нізкай ступені і ў разрыве з стаханаўскім рухам. Гэта ўскрылася на нарадзе па будаўніцтву пры ЦК КП(б)Б, дзе арганізатары вытворчасці будматэрыялаў надзвычай нясмела, неарганізавана адказвалі на чотка пастаўленае тав. **Гікало** патрабаванне аб павышэнні вытворчасці пэглы на 180 мільёнаў штук (у асноўным на існуючых заводах і абсталяванні).

Па плану 1936 года трэба асвоіць — у тэрмін і пры высокай якасці — 160 мільёнаў руб. толькі па рэспубліканскай гаспадарцы і культуры. Больш чым у паўтара раза ў гэтым годзе павялічаны супроць 1935 г. капіталаўкладанні. Трэба з першых-жа дзён года арганізаваць усю работу па будаўніцтву, не адкладваючы яе к пачатку другога паўгоддзя, як гэта бывала раней. Трэба па ўсіх ступенях будаўніцтва і вытворчасці будматэрыялаў паставіць работу так, як ставяць яе стаханаўцы. Тав. **Молатаў**, выступаючы на нарадзе па будаўніцтву пры ЦК ВКП(б), паставіў, як асноўную, задачу — узняць узровень усёй нашай работы ў будаўніцтве. «Працаваць так, як лепшыя працуюць», — сказаў у рэпліцы таварыш Сталін. Маючы ўзоры работы лепшых стаханаўцаў на будоўлях і ў прамысловасці будматэрыялаў, мы павінны высока ўзняць работу ўсіх арганізацый, вядучых будаўніцтва і вытвараючых будматэрыялы.

К пачатку студзеня няма яшчэ праектаў і каштарысаў па большай частцы будоўляў, няма, тым больш, дагавораў на будаўніцтва. Наркаматы «навольна паспяшаюць», паказваючы зусім адваротнае арганізаванасці стаханаўцаў. Абломаўскія тэмпы, спячка не ліквідаваны і ў праектыроўшчыкаў, якія к таму-ж не лічацца ні з якімі лімітамі, зацверджанымі ўрадам, і зусім не лічаць для сябе абавязковым праектаваць добра і танна. Яны складаюць праекты нават не бачачы, не ведаючы месца, дзе праектуецца будоўля. Будаўнікі, у сваю чаргу, да гэтага часу не маюць ніякага плана арганізацыі работ. Сапраўдная будаўнічая індустрыя, якую мы павінны стварыць, абавязана, таксама як і ва ўсёй прамысловасці, мець дакладны план работ па кожнай будоўлі не толькі на год, але і па кварталах, месяцах, дэкадах.

Але для таго, каб будаўнік своечасова выконваў работу, яму патрэбна атрымаць заказ разам з зацверджаным праектам і каштарысам, якія па закону павінны быць гатовы к 1 снежню — напярэдадні новага гаспадарчага года. Без праектаў і каштарысаў забаронена фінансаванне будоўляў. Але гэтым добра ведаюць наркаматы, трэсты і ўсё-ж ад праектах і каштарысах сапраўдных клопатаў няма няма турботы за пагражаючы зрыў будаўніцтва важнейшых аб'ектаў прамысловага, комунальнага і культурнага будаўніцтва.

Адсюль і выпякае тая «прывычка да невыканання будаўнічых праграм», аб якой, як галоўным недахопе ў будаўніцтве, гаварыў тав. **Молатаў**. Вось некалькі прыкладаў: НК мясцовай прамысловасці мае к студзеню менш паловы патрэбных праектаў і каштарысаў па аб'ектах будаўніцтва і намячае атрымліваць астатнія праекты на працягу ўсяго 1936 года, аж да студзеня. НК Комунальнай Гаспадаркі мае ў сябе буйную праектную арганізацыю — Белдзяржпраект, і тым не менш нават па важнейшаму жыллёваму будаўніцтву не забяспечан праектамі больш чым на 50 проц. будоўляў. Няма яшчэ каштарысаў на школьнае будаўніцтва па Народнаму камісарыяту асветы.

Але затое складаюцца томы розных «дадатковых» каштарысаў, якія з'яўляюцца па сутнасці хвастамі безгаспадарчасці па раду будоўляў 1935 года. Да гэтага ліку належыць менская лазня, якая да гэтага часу фактычна не пачата будоўляй, няма канчатковага праекту і каштарысаў, хоць павінна была быць пабудавана яшчэ ў 1935 годзе. Лазня не расце ў будаўніцтве, але растуць разлікі яе кошту, павысіўшыся ад зацверджаных СНК 910 тыс. рублёў да 1.300 тыс. рублёў.

Хто вінават у гэтым? Заказчык спасылаецца на праектыроўшчыка, які не выканаў у тэрмін, сказіў, перавысіў заданні і ліміты. Праектуючая арганізацыя ківае на заказчыка, які не даў дакладнага задання і, да таго-ж, позна заказаў праект. А будаўнік у радзе выпадкаў браў будоўлю без праверанага праектаў і каштарысаў, а затым або спыняў яе, або «ставраў» розныя «дадатковыя», «карэктыруючыя» каштарысы, рэзка ўдаражаючы будаўніцтва ў параўнанні з тым, што было зацверджана ўрадам. Усё гэта прыкрывала безгаспадарчасць як заказчыка і праектыроўшчыка, так і самога будаўніка.

Па будаўніцтву 1936 года кожны будзе адказваць за сваю частку выканання плана будаўніцтва.

Тав. Молатаў цвёрда паставіў пытанне аб тым, што «трэба назаўсёды расстацца з дробнабуржуазнай устаноўкай на сезонніка і працаваць на будоўлях пастаяннымі кадрамі». У прыкладах крайняй шкоднасці ўстановак на сезоннасць і «сезонніка» няма недахопу ў будаўніцтве па БС. За 9 месяцаў 1935 года завербавана было на будаўніцтва 236 проц. рабочых ад сярэднесутачнай іх наяўнасці на будоўлях. За гэты-ж час зволена 230 проц. А кожны завербаваны каштаваў, апрача зарплаты, 60—100 рублёў выдаткаў па бясконца і без толку ідучай вярбоўцы.

Будіндустрыя патрабуе пастаянных рабочых, пастаянных круглагадніх работ. Аб гэтым была пастанова СНК БССР, вынесеная ў пачатку кастрычніка 1935 года. Але яна аказалася выкананай толькі часткова, на некалькіх будоўлях Белпрамбуда і Белкамунбуда (тэатр, дом піянераў). І не выпадкова, што на гэтых будоўлях больш усяго разгарнуўся стаханаўскі рух. З пастаянных, аўладаўшых тэхнікай справы, рабочых вышлі стаханаўцы і на будаўніцтве і на цагельных заводах.

Галоўнейшая задача — і для будіндустрыі і для прамысловасці будматэрыялаў—арганізацыя рабочай сілы, асваенне ёю тэхнікі, стварэнне бытавых, культурных умоў для рабочай масы, усебаковая дапамога ў разгортванні стаханаўскага руху сярод будаўнікоў і рабочых, вытвараючых будматэрыялы, прыцягненне да гэтай справы тэхнікаў і інжынераў.

Разгортванне стаханаўскага руху ў будаўніцтве прымусіць па іншаму паставіць работу па ўсёй лініі будаўніцтва, у прыватнасці ў праектаванні і каштарысах, дзе павінна быць высокая дысцыпліна, дзе патрэбна дакладнасць, быстрыня разліку. Уся арганізацыя праектаў, каштарысаў і будаўніцтва павінна быць пабудавана па плану, па дакладных тэрмінах, з безумоўным выкананнем плана так, як ён выконваецца ўсёй прамысловасцю БССР.

«Стаханаўскі рух гэта такі рух рабочых і работніц, які ставіць сваёй мэтай перамаганне цяперашніх тэхнічных норм, перамаганне існуючых праектных магутнасцей, перамаганне існуючых вытворчых планаў і балансаў» (**Сталін.** Прамова на першай усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў).

У матэрыяльнай базе будаўніцтва — на цэгле ваннє і іншых будаўнічых матэрыялах у разгортванні стаханаўскага руху ясна відны вялікія рэзервы магутнасцей, вялікія магчымасці расшырэння вытворчасці, каб поўнасцю і ў тэрмін забяспечыць будаўніцтва і выканаць з гонарам план важнейшых і вялікіх па аб'ёму заданняў, якія даны нам на 1936 год партыяй і ўрадам.

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

Учора ў клубе імя Сталіна адкрыўся пленум Менскага гарадскога совета. Апрача дэпутатаў горсовета, у зале прысутнічала многа стаханаўцаў менскіх прадпрыемстваў. З дакладам аб рабоце горсовета за 1935 год і народнагаспадарчым плане на 1936 год выступіў старшыня горсовета тав. **Жуковіч.**

На пленуме прысутнічалі старшыня ЦВК БССР тав. **Чарвяконў, тт. Кавальчук, Хадасевіч і Лаўкоў.**

Працяг пленума сёння ў клубе імя Сталіна, у 6 гадзін вечара.

ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ

Цэнтральнае праўленне профсаюза рабочых МТС і Наркамзем БССР арганізуюць пры вышэйшай комуністычнай сельскагаспадарчай школе імя Леніна завочныя курсы па павышэнню кваліфікацыі агранамаў і механікаў МТС. На курсы будуць прыняты 144 чал. За час навучання яны будуць вывучаць трактарную справу, агратэхніку, вагатэхніку, матэматыку, беларускую мову, эксплаатацыю сельскагаспадарчых машын і т. д. Курсанты будуць выкліканы ў Менск у пачатку заняткаў для праслухання ўводных лекцый і другі раз — для здачы залікаў.

НАВУКОВЫЯ ЛЕКЦЫІ Ў КАЛГАСЕ

ЖЫТКАВІЧЫ, 29 студзеня. (**Спец. кар. «Звязды»**). Учора ў Жыткавіцкі раён прыехаў навуковы працаўнік хімічнага інстытута Беларускай Акадэміі навук т. Стэфкін. У калгасе «Завет Леніна» ён прачытаў лекцыю на тэму «Мінеральныя ўгнаенні і іх прымяненне ў сельскай гаспадарцы». На лекцыі прысутнічала больш 100 калгаснікаў і калгасніц, лектару было задана шмат пытанняў. Такія-ж лекцыі будуць прачытаны яшчэ ў двух калгасах.

ДВУХПАВЯРХОВЫ КАЛГАСНЫ КЛУБ

20 студзеня ў калгасе імя Варашылава, Тураўскага раёна, урачыста закладзена пабудова новага двухпавярховага клуба. Гэтымі-ж днямі калгас закупіў музычныя інструменты для калгаснага струннага гуртка.

ПАДВОЕНЫ УРАДЖАЙ КАНАПЕЛЬ

У соўгас імя Дзесяцігоддзя БССР у Любаньскім раёне ўпершыню ў мінулым годзе быў праведзен вопыт прымянення на асушаным балоце калчаданнага агарка пад канопліі. Эфект атрымаўся велізарны. Даказана магчымасць атрымання падвоеных ураджаяў. Так, пры ўнясенні ў глебу поўнай нормы фосфарна-калійных угнаенняў атрыман ураджай ачосанай канаплянай саломы — 38,2 цэнтнера з гектара, а пры дабаўленні калчаданнага агарка — 72 цэнтнеры (павеличэнне на 86—89 проц.). Сярэдні ўраджай на мінеральных глебах БССР да 30 цэнтнераў канаплянай саломы. Важна адзначыць, што канопліі дагэтуль лічыліся культурай, не рэатуючай на медныя ўгнаенні, якім з'яўляецца калчаданны агарак. У бягучым годзе ў соўгас завозіцца 5—6 вагонаў агарку з тым, каб выкарыстаць яго на плошчы ў 550 гектараў.

НОВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ МЕТАЛААПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

У бягучым годзе пачнецца пабудова раду новых цэхаў і прадпрыемстваў металаапрацоўчай прамысловасці БССР, прызначаных, галоўным чынам, для расшырэння вытворчасці прадметаў шырокага спажывання. У Менску па магілёўскай шашы адведзены ўчастак для пабудовы фурнітурнага завода, які будзе даваць штогод на 12 млн. руб. прадукцыі. Пуск завода вызначан у 1937 годзе. На акулярнай фабрыцы ў Віцебску будуецца новы магутны цэх аптычнага шкла. У Магілеве запраектавана пабудова першага ў рэспубліцы цэха па пракатцы дажавага жалеза для вырабу прадметаў шырокага спажывання магутнасцю ў 5.500 тон пракату ў год. У Віцебску на іголкавай фабрыцы будзе будавацца новы цэх ручных іголак. З пускам цэха фабрыка павялічыць выпуск ручных іголак да 600 млн. штук у год. На будаўніцтва гэтых прадпрыемстваў у бягучым годзе асігнавана каля 4 млн. рублёў.

КУЛЬТУРНЫЯ СЕЛЬСОВЕТЫ БССР

Конкурс на лепшы культурны сельсовет быў абвешчан прэзідыумам ЦВК БССР з 1 мая па 1 лістапада 1935 года. З 1.473 сельсоветаў рэспублікі ў конкурсе прымала ўдзел 1.200 сельсоветы, 1.200 секцый і 36.845 членаў секцый, дэпутацкіх груп і актывістаў.

Узорна праведзен конкурс па Аршанскаму раёну. Кудаеўскі сельсовет (старшыня Мяжуеў І. Я.) — узор культурнай установы. З малой няўтульнай хаткі з разбітымі вокнамі сельсовет перайшоў у новы і светлы будынак. Абсталяваны габінет старшыні, сакратара і рахункавода, зала пасяджэнняў і асобны пакой загса. Усе пакоі аббіты прыгожымі шпалерамі, дзверы і вокны афарбаваны масляными фарбамі, на вокнах расстаўлены вазоны. Набыты новыя сталы, дываны і венскія крэслы. У культурны выгляд прыведзены таксама Дубраўскі, Яромкаўскі, Зубаўскі і Смалянскі сельсоветы.

У Барысаўскім раёне ўзорнымі з'яўляюцца Кішчына-Слабодскі і Лозінскі сельсоветы.

Па папярэдніх даных, па БССР ёсць звыш 100 сапраўды ўзорных культурных сельсоветаў. Конкурсная камісія ЦВК БССР выдзяляе для прэміравання 19 перадавых культурных сельсоветаў. У ліку прэмій ёсць аўтамашыны, мэблевае абсталяванне, радыёпрыёмнікі, гадзіннікі і т. д.

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА СОВЕТА АСОАВІЯХІМА БССР

Учора адкрыўся V пленум Цэнтральнага совета Асоавіяхіма БССР.

У ганаровы прэзідыум пленум выбраў Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам **Сталіным**, тт. **Гікало, Галадзеда і Эйдэмана.**

Пленум давыбраў склад прэзідыума Цэнтральнага совета, у тым ліку тт. Мілонава, Сераброўскага, Ксенію Еўсуціну, Любовіч і інш. За бяздзейнасць са складу пленума выведзен тав. Пінчук (Гомельская арганізацыя). Тав. Мілонаў, выбраны пленумам старшынёй прэзідыума ЦС Асоавіяхіма БССР, выступіў з дакладам аб папярэдніх выніках рэалізацыі пастаноў VI пленума ЦС Асоавіяхіма СССР. Сёння пленум закончыць сваю работу.

НАПЯРЭДАДНІ ПЛЕНУМА ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ СССР

28 студзеня ў Доме пісьменніка адбыўся сход паэтаў БССР. На сходзе паэт **Андрэй Александровіч** зрабіў падрабязнае паведамленне аб асноўных палажэннях свайго даклада аб беларускай паэзіі, які ён будзе рабіць на пленуме.

Вакол праблем, узнятых у дакладзе, разгарнулася цікавая творчая дыскусія. Выступалі — тт. Харык, Крапіва, Куляшоў, Броўка, Грубіян, Хведаровіч, Клімковіч і Кучар.

БЮРО СЕКЦЫІ ПАЭТАЎ

На сходзе паэтаў БССР, які адбыўся 28 студзеня, было выбрана бюро секцыі паэтаў. У склад бюро выбраны Янка Купала, Якуб Колас, Андрэй Александровіч, Ізі Харык, П. Броўка, З. Аксельрод і Кавальскі. Старшынёй бюро секцыі выбраны паэт **Андрэй Александровіч.**

ГАЗЕТНЫЯ РАДКІ

ЛАЗНЯ І ЦЫРУЛЬНЯ Ў ВЕРХНІХ ЖАРАХ

Новая цагельная лазня нядаўна адкрыта ў калгасе «Рухавік рэвалюцыі», Верхне-Жараўскага сельсовета (Камарынскі раён). Адкрыта таксама калгасная цырульня, у якой ёсць вялікае люстра-трумо, неабходныя прылады, адэкалон. Лазня працуе тры разы на тыдзень, цырульня — штодзённа.

У дарэвалюцыйны час большасць сялян вёскі Верхнія Жары не ведала, што такое лазня. Дзед Агей Іванавіч Блудчы, які 40 год не быў у лазні, пасля адкрыцця яе ў калгасе памыўся, а потым пастрыгся ў цырульні. («**Калгасны сцяг**»).

РАДЗІЛЬНАЯ ДАПАМОГА НА ВЁСЦЫ

У Заскарскім, Гарадоцкім, Тураўлянскім і Семянецкім сельсоветах, Ветрынскага раёна, арганізаваны акушэрскія пункты. У трох калгасах раёна адкрываюцца хаты-радзільні. («**Большэвік Полаччыны**»).

АСВАЕННЕ ПІЛЫ ГЕЛЕРА

На заводзе імя Кірава (Менск) пачаліся работы па асваенню выпуску складанай пілы Гелера (варштат для рэзкі металу). Па плану Галоўнага кіраўніцтва варштатабудаўніцтва завод павінен у 1936 годзе выпусціць 30 піл. Зараз рыхтуюцца мадэлі, праводзіцца стружка дэталей і іншыя падрыхтоўчыя работы. Асваеннем выпуску пілы Гелера кіруюць тэхнічны дырэктар **Шлапакоў**, інжынер **Гершун** і начальнік механа-зборачнага цэха **Мацюш.**

У выходны дзень у садзе «Профінтэрн» (Менск)

НА ЗДЫМКУ: вучні 5-й школы Осіпаў, Лявінскі і Зубкоўская — з 22-й школы — катаюцца на лыжах.

Фото САЛАВЕЙЧЫКА.

З мільёны кніг

У 1935 годзе ў чытальнях Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна ў Менску зарэгістравана 400 тыс. наведванняў. Чытачам выдана 713 тыс. кніг. Лічбы рэкордныя за ўвесь час існавання бібліятэкі. У хавальнях яе налічваецца паўтара мільёна кніг. У даны момант у Менску — 295 масавых і навуковых бібліятэк — пры Акадэміі навук, навуковых інстытутах, вышэйшых навучальных установах, рабочых клубах, школах — з фондам у 3 мільёны кніг. Гэтыя лічбы асабліва паказальны, калі ўлічыць, што да рэвалюцыі ў Менску налічвалася ўсяго 3 бібліятэкі з кніжным фондам у 30 тыс. кніг.

ЛІКВІДАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ «ТАРГСІНА»

Намеснік кіраўніка Беларускай канторы «Таргсіна» т. Нісенбаум паведаміў супрацоўніку «Звязды», што згодна пастановы ўрада рэспубліканская кантора «Таргсіна» і яе філіялы на мясцах спыняюць сваю дзейнасць з 1 лютага. Запазычанасць па чэкавых і разліковых кніжках ліквідавана. Сетка магазінаў «Таргсіна» перадана «Гастраному», «Белхарчгандлю» і іншым гандлёвым арганізацыям. Усе неатаваранныя разліковыя кніжкі пасля 1 лютага анулююцца.

ГАНДЛЁВАЯ ХРОНІКА

* У булачнай № 143 на рагу вуліц Совецкай і Энгельса (Менск) з учарашняга дня пачаўся продаж гатовага цеста ўсіх гатункаў пшанічнай мукі. Цэны на цеста тыя-ж, што і на гатовыя булачныя вырабы.

* Устаноўлен асартыментны мінімум для хлебнабулачных магазінаў Менска. Уся гандлёвая сетка разбіта на чатыры групы. Магазіны першай групы будуць мець у асартыменце не менш 60 гатункаў хлеба і хлебнабулачных вырабаў, другая — 55 гатункаў, трэцяя — 45 гатункаў. Да чацвертай групы аднесены ларкі з асартыментам 15 гатункаў.

На новую сістэму гандлю магазіны пяройдуць у лютым.

Коратка

(Ад карэспандэнтаў «Звязды» і БЕЛТА).

* **П'есе «Вайна»** народнага паэта рэспублікі Якуба Коласа будзе пастаўлена ў гэтым годзе ў Беларускім другім дзяржаўным тэатры.

* **Радыётэхнічны габінет** — першы ў БССР — заканчваецца абсталяваннем у Менску, у будынку Белрадыёкамітэта.

* **На курорт у Лівадзію** (Крым) выехала 28 студзеня намеснік старшыні калгаса «Чырвоныя Скарынічы» (Меншчына), член ЦВК БССР тав. Кульба. Пуцёўкай на курорт яна прэміравана райвыканкомам за адданую работу на павышэнню калгаснага ўраджаю.

* **На кватэры** рабочага-стахановца абутковай фабрыкі імя Кагановіча (Менск) тав. Г. Скабло, Беларускі радыёкамітэт арганізуе 1 лютага радыёвечар, прысвечаны стагоддзю з дня нараджэння яўрэйскага пісьменніка Менделе Мойхер-Сфорым.

* **Першы выпуск кіножурнала** пра італа-абісінскую вайну атрымала з Масквы Белдзяржкіно. Здымкі зроблены аператарамі Цейтліным і Якушыным у Абісініі. Дэманстрацыя кіножурнала на экранах Менска пачнецца 1 лютага.

* **Пераскавачная хата-лабараторыя** абсталёўваецца Горацкім сельскагаспадарчым інстытутам. Разам з ёю будуць выязджаць у калгасы навуковыя работнікі для чытання лекцый па пытаннях сельскай гаспадаркі.

* **Выпрацоўку бляшанай пасуды** пашырае барысаўскі завод «Чырвоны металіст». Сёлета завод выпусціць 20 тыс. бідонаў для малака, 20 тыс. бідонаў для газы і значную колькасць рознай пасуды.

* **Вытворчасць дзіцячых музычных інструментаў і цацак** асвойвае віцебская фабрыка гнутай мэблі. Выпушчаны першыя 100 дзіцячых цымбал і 100 балалаек.

* **У пераход на лыжах** па маршруту Магілеў—Менск выйшлі 27 студзеня 5 студэнтаў магілёўскага медыцынскага політэхнікума.

* **Лекцыя ў супрацьгазах** была арганізавана на раффаку БДУ. Як выкладчык, так і студэнты былі ў супрацьгазах. Слухачы канспектавалі лекцыю.

«КАТКІ ЎДЗЕНЬ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ»

Пад такім загалоўкам была змешчана заметка ў № 15 «Звязды».

Як паведаміў супрацоўніку «Звязды» адказны сакратар ЦСПСБ тав. Гераўкер, каток бюро фізкультуры ЦСПСБ у садзе «Профінтэрн» з 31 студзеня з 12 да 16 гадзін штодзённа разам з раздявалкай прадастаўляецца дармова для дзяцей.

Адказны сакратар менскага горсовета тав. Кавалоўскі паведаміў, што каток стадыёна «Дынамо» з 1 лютага з 11 да 17 гадзін штодзённа будзе прадастаўляцца дармова для дзяцей. На катку будзе працаваць раздявалка.

СУСТРЭЧА ЛЕПШЫХ ВАЛЕЙБАЛІСТАЎ РЭСПУБЛІКІ

На ўсебеларускіх міжведамасных спаборніцтвах па валейболу, якія адбываліся 27 і 28 студзеня, першае месца сярод мужчынскіх команд заняла каманда БВА, другое месца профсаюзы. Без паражэння вышла жаночая каманда профсаюзаў, у складзе якой іграді тт. Тарасевіч, Касперская, Шарашэўская, Міхалькова, Фаменка і Каплан. Агульнае пярэшынства падзялілі каманды БВА і профсаюзаў.

Мужчынская каманда «Спартака» не прымала ўдзелу ў спаборніцтвах. Судзейская калегія забараніла іграць лепшаму ігроку гэтай каманды Крылову за лятунства. Аднак, Крылоў як спартсмен пакуль яшчэ за гэта не дыскваліфікаваны і зусім нядаўна іграў за зборную горада супроць валейбалістаў Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра СССР. У выніку ўся каманда «Спартака» адмовілася выступаць. Рашэнне суддзяў было на-руку астатнім ведамствам, пад націскам якіх, уласна кажучы, яно і вынесена. У апошні дзень спаборніцтваў суддзі дазволілі спартакаўцам выступіць у поўным сваім складзе, уключаючы і Крылова, але па-за залікамі. Цікава, што скажа адносна ўсяго гэтага Вышэйшы совет фізкультуры?

ЦЫВЕС.

СПІС

таварышоў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для правядзення дакладаў аб пленуме Саюза совецкіх пісьменнікаў:

Завод імя Варашылава — **Клімковіч;** завод імя Кірава — **Краснеўскі** (БелАН); завод «Большэвік» — **Вальфсон** (БелАН); фабрыка «Комунарка» — **Брэнштэйн** (ССП); рыка імя Крупскай — **Лынькоў** (ССП); мясакамбінат — **Фрыдрых** (БелАН); ТЭЦ — **Гурскі** (ССП); завод «Чырвоны золак» — **Каплінскі** (БелАН); МТМ—**Вержбаловіч** (рэдакцыя газеты «Звязда»); спіртазавод — **Лезоўскі** (ВКСГШБ); аўтарэмстанцыя — **Зарніцкі** (КІЖ); фабрыка «Кастрычнік» — **Александровіч;** фабрыка імя Кагановіча — **Старнін** (рэдакцыя газеты «Звязда»); фабрыка імя Куйбышэва — **Ірушын** (БелАН); шчотачная фабрыка — **Харык** (ССП); фабрыка імя Тэльмана — **Драгілаў** (КІЖ); завод «Харчнік» — **Краўчун** (КІЖ); хлебазавод — **Карабан** (дзяржбібліятэка); шклозавод — **Мельцэр** (ВШ); фабрыка «Чырвоны текстыльшчык» — **Мельшаў** (КІЖ); фабрыка індывідуальных заказаў — **Штаркман** (БелАН); малочны завод — **Шнейдэр** (БелАН); хімфармазавод — **Сапалінскі;** шпалерная фабрыка — **Шпітальнік;** лямцавая фабрыка — **Нацовіч** (ССП); завод «Чырвоны хімік» — **Пінчук** (ВКСГШБ); завод імя Молатава — **Жукаў** (ДВВ); завод ланцугоў Галя — **Рубінштэйн** (ЦСПСБ); фабрыка імя Фрунзе — **Лагодзіч** (партвыдавецтва); трампарк — **Гапавач** (ССП); завод стандартных дамоў — **Жаўрыд;** друкарня імя Сталіна — **Бекерман** (Кімзад); скарняжная фабрыка — **Мозаль** (ССП); завод «Беларусь» — **Рубежны** (рэд. «Звязды»); дражджавы завод «Пролетарый» — **Кабкоў** (рэд. «Окцябр»); завод малочных кіслот — **Ансёнцей** (політэхнічны інстытут); фабрыка «КІМ»—**Выдра;** фабрыка «8 сакавіка» — **Фішбейн** (рэдакцыя «Рабочай»); электрастанцыя — **Лур'е** (ВКСГШБ).

РЭЗЕРВ

Кузняцоў, Гурчанка, Сігналаў (ЦК), **Ашаровіч, Хейфец** (НКА), **Юраў, Радзецкі** (ВКСГШБ), **Голінаў, Мінкін** (рэд. «Большэвік Беларусі»), **Бярэн, Бірыла** (ЦП вышэйшай школы), **Новедворац** (НКА), **Ратнер** (спецлаб.), **Годэр** (інстытут соўправа), **Добрускін** (нервовая клініка), **Данільчык** (музей рэволюцыі), **Ільюшын** (БелАН), **Гушчыц** (БЕЛТА), **Ніхамкін** (рэдакцыя «Звязды»), **Пам** (рэд. «Окцябр»).

ЗАЎВАГІ:

Інструкцыйны даклад для дакладчыкаў, прапагандыстаў і агітатараў па пытанню аб надыходзячым пленуме Саюза совецкіх пісьменнікаў адбудзецца 1 лютага гэтага года ў малой зале Дома партактыва у 7 гадзін вечара.

Тэрмін правядзення дакладаў 1 гутарак па пятрвічных арганізацыях аб пленуме ССП назначан з 1 па 10 лютага г. г.

Сакратар Менгаркома КП(б)Б ХАДАСЕВІЧ.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Сёння, 30 студзеня, роўна ў 6 г. вечара ў клубе імя Сталіна (бул. Інтэрнацыянальнай і Комсамольскай) працяг пасяджэння пленума Менскага горсовета.

У парадку дня — справкі па дакладу аб выніках работы горсовета за 1935 год і народнагаспадарчым плане на 1936 год.

Яўка членаў і кандыдатаў у члены горсовета абавязкова.

Выданыя запрашальныя білеты сапраўдныя.

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

ЗДАРЭННЕ

* **Бацька-нягодніх.** Шофер менскай канторы Заготзярно Н. А. Шумскі прышоў п'яны дамоў і пачаў збіваць сваіх дзяцей. Ён таксама прабаваў пабіць жонку, але апошняя ўцякла з хаты. Шумскі арыштаваны.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1 | Сёння, 30 студзеня. БАЦЬКАЎШЧЫНА. Пачатак у 8 г. веч.

Білеты прадаюцца ў касе тэатра.

Пам. клуба МЕТАЛІСТАЎ (вул. Кірава, 12, тэл. 25-384) | Спектаклі смаленскага абласнога тэатра музкамедыі

Сёння, 30 студзеня, (паст. картка № 48)

Mlle НІТУШ

Пачатак роўна ў 8 гадз. вечара. Каса адкрыта з 12 да 2 гадз. дня і з 5 да 9 гадзін вечара.

Гукавы кінотэатр „Чырвоная зорка" | Гукавы мастацкі фільм ПАДРУГІ

ГУКАВЫ КІНОТЭАТР «ПРОЛЕТАРЫЙ» | Амерыканскі гукавы фільм Чалавек-невідзімка

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» | Гукавая камедыя ТРЫ ТАВАРЫШЫ

Кіно «СПАРТАК» | Выдатны мастацкі фільм БЭЛЛА

БЕЛДЗЯРЖСПІРТУ ПАТРАБУЮЦЦА

аграномы

па аграабслугоўванню баз сыравіны спіртазаводаў. Аплата па згодзе.

Зварачацца: Менск, Гарбарная, 17, сектар кадраў.

ДЫРЭКЦЫЯ ТРЭСТА

МЕНСКІ ГАРАДСКІ СОВЕТ

паведамляе, што па пытаннях правядзення справаздачнай кампаніі горсовета

У ГОРСОВЕЦЕ ўстаноўлены дзяжурствы

з 10 да 4 гадзін дня і з 7 да 12 гадзін ночы ў пакоях №№ 45 і 32, тэлефоны 20-850, 23-983 і 23-193.

ГОРСОВЕТ.

ДА ВЕДАМА ЎСІХ ПАДПІСЧЫКАЎ НА ВЫДАННЕ

„ИСТОРИЯ ГРАЖДАНСКОЙ ВОЙНЫ".

Вышаў з друку і ў бліжэйшы час будзе рассылацца падпісчыкам першы том выдання «История гражданской войны».

Усім падпісчыкам на гэта выданне паведамляецца, што раней абумоўлены (пры прыёме заказаў) кошт у 7 р. 50 к. за том, з прычыны павелічэння аб'ёму выдання, багатых ілюстрацый і прыгожага афармлення — павышаецца. Цана 1 тома ўстанаўляецца ў 20 руб.

Просім усіх падпісаўшыхся на выданне неадкладна пацвердзіць сваю згоду на атрыманне першага тома па новай цане.

Тыя-ж падпісчыкі, якія не дадуць згоды атрымаць «Историю гражданской войны» па новай цане, павінны паведаміць аб сваім адмаўленні для анулявання заказу. Адмовіўшымся ад сваёй падпіскі залатак будзе звернут.

Пацвярджэнне высылкі першага тома «Истории гражданской войны» па новай цане або адмаўленне ад падпіскі на гэта выданне просім паведаміць неадкладна (адкрыткай) па адрасу: г. Менск, Совецкая, 41, экспедыцыя падпісных выданняў беларускага аддзялення КОГІЗ'а (тэл. 23-709).

Адначасова трэба паведаміць:

1. Нумар вашага заказу.
2. На які адрас праведзена была вамі падпіска.
3. Ваш новы адрас (калі ён змяніўся).
4. Прозвішча, імя і імя па-бацьку — поўнасцю.

БЕЛАРУСКІ АДДЗЕЛ ПАДПІСНЫХ І ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ КОГІЗ'а.

Кантора МАЛЯРБУДА (пры Белпромбудтрэсце)

прымае заказы па ўсёй Беларусі на розныя масляныя, клеявыя, пабелачныя работы, роспіс паталкоў і сцен.

АДРАС: Менск, Рэволюцыйная, 3, Малярбуд.

31 студзеня ў 7 гадзін вечара, у актавай зале вучэбнага корпуса № 1 для студэнтаў 1 і 2-га курсаў вячэрняга комвуза і соўпартшколы будзе пастаўлен

ДАКЛАД аб міжнародным становішчы.

Пасля даклада — кіно.

ВЯЧЭРНІ КОМВУЗ ІМЯ ЛЕНІНА.

УСІМ СТАРШЫНЯМ КАМСОДАЎ

Менгаркамсод даводзіць да ведама, што 31 студзеня ў 7 гадзін вечара ў горсовеце (вуліца Карла Маркса, 16, пакой 32)

адбудзецца нарада (семінар)

старшынь камсодаў, членаў камсодаў і ўсяго фінансавага актыва г. Менска

па пытанню пераходу горашчадкасы № 16 на новую сістэму работы „Адзінай ашчадкніжкі"

Яўка ўсіх старшынь камсодаў і членаў камсодаў абавязкова.

Білеты на нараду (семінар) старшыні камсодаў павінны атрымаць у горкамсодзе (горсовет, вуліца Карла Маркса, 16, другі паверх, пакой 22).

Пасля нарады — мастацкая частка.

МЕНГАРКАМСОД.

УКРАИНСКИЙ ЦЕНТРАЛЬНЫЙ ИНСТИТУТ ЭНДОКРИНОЛОГИИ и ОРГАНОТЕРАПИИ

Харьков ул. Кирова 10

ГЕМАТОГЕН

ДЕТСКИЙ в пастилках и для ВЗРОСЛЫХ в дражированных таблетках

ПРИМЕНЯЕТСЯ ПРИ МАЛОКРОВИИ УПАДКЕ ПИТАНИЯ, ЯВЛЕНИЯХ ИСТОЩЕНИЯ РАХИТЕ и НАЧАЛЬНЫХ ФОРМАХ ТУБЕРКУЛЕЗА

ПРОДАЖА во всех аптеках и магазинах санитарных СССР, а при отсутствии на местах высылается почтой

УВАГА!

Паступілі ў продаж лішкі наступных падпісных выданняў:

„СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННАЯ ЭНЦИКЛОПЕДИЯ"

тамы 2, 3 і 4.

Цана 2 і 3 тамоў па 6 р. 50 к., цана 4 тома — 8 руб.

„ТЕХНИЧЕСКИЙ СПРАВОЧНИК ТРАНСПОРТНИКА"

тамы 3, 5, 6, 7 і 8.

Цана тамоў: 3 — 15 р., 5 — 14 р. 20 к., 6 — 11 р. 70 к., 7 — 10 р. 50 к., 8 — 11 р. 70 к.

„ТЕХНИЧЕСКАЯ ЭНЦИКЛОПЕДИЯ"

тамы 23, 24, 25 і 26

Цана кожнага тома 10 р.

„БОЛЬШАЯ СОВЕТСКАЯ ЭНЦИКЛОПЕДИЯ"

тамы 22, 27, 59, 60, 61, 62 і 64.

Цана кожнага тома 10 руб.

Заказы на ўказаныя кнігі выконваюцца накладной платай па атрыманні заявак.

Заяўкі шлеце па адрасу: г. Менск, Совецкая, 41, экспедыцыя Беларускага аддзела падпісных і перыядычных выданняў КОГІЗ'а.

Бел. аддзел падпісных і перыядычных выданняў КОГІЗ'а.

Друкарні „ЗВЯЗДЫ" ПАТРЭБЕН КВАЛІФІКАВАНЫ РЭЗЧЫК ПАПЕРЫ

Зварачацца: Совецкая, 63, кантора друкарні.

ЗГУБЛЕНЫЯ І ЎКРАДЗЕНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМІ:

Сцепаненка А. А. — вайсковы білет і профбілет, Комар Ю. С. — пашпарт, Ераменак В. Ф. — пропуск на фабрыку «Окцябр», Яновіч А. А. — комсамольскі білет, Давідсон Д. А. — профбілет, Бернштэйн Я. І. — профбілет, Цвірбут У. К. — пашпарт, Мартыновіч А. Ф. — вайсковы білет, Бурачэўскі І. С. — пашпарт, Бутакевіч А. С. — метрычны выпіс, Шмагун П. Ф. — профбілет, Яраш-эвіч С. А. — вайсковы білет, Леднікаў І. К. — квіток, выданы камісійным магазінам, Ермановіч С. Ф. — пашпарт, Гарошка А. М. —пашпарт, Пілюцкая С. В. — пашпарт і профбілет, Вайнер А. — пашпарт.

ПАТРЭБНЫ прыбіральшчыцы.

Зварачацца: Совецкая, 63, выдавецтва „ЗВЯЗДЫ"

Уп. Галоўлітбела № К—24. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Тыраж 106.045.